ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 30 СТУДЗЕНЯ 1939 г. № 6 (420) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ВОСЕМНАЦЦАТЫ З'ЕЗД ВКП(б)

Апублікаванае ўчора ў «Праўдзе» рашэнне Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб тэрміну склікання і парадку дня чарговага XVIII з'езда партыі гаворыць аб вялікай, знаменальнай падзеі ў жыцці ўсёй нашай партыі, усяго совецкага народа.

Пяць год прайшло з часу папярэдняга, XVII з'езда ВКП(б). Семнаццаты з'езд, які сабраўся ў студзені 1934 года, «падвёў вынік рабоце партыі за прайшоўшы перыяд, адзначыў рашаючыя поспехі соцыялізма ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры і ўстанавіў, што генеральная лінія партыі перамагла па ўсёй лініі.

XVII з'езд партыі ўвайшоў у гісторыю, як «з'езд пераможцаў». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»)

Мінуўшае пяцігоддзе прайшло пад сцягам героічнай барацьбы працоўных нашай радзімы за далейшыя, яшчэ больш грандыёзныя, поспехі соцыялізма, і гэта барацьба ўвянчалася трыумфам марксізма-ленінізма, нябачаным торжаством партыі Леніна—Сталіна, прывёўшай наш народ да сусветна-гістарычных перамог. Велічны будынак соцыялізма пабудован у нашай краіне, ён прадстаў перад усім светам, як яркі светач, як маяк для ўсіх прыгнечаных! Соцыялізм, аб якім марылі пакаленні, увайшоў у быт совецкага народа, ён стаў сапраўднасцю, ён пранізаў усё наша жыццё. СССР уступіў у новую паласу развіцця. XVIII з'езд ВКП(б) Совецкі Саюз сустракае, ідучы на ўсіх парах да комунізма!

Годы, аддзяляючыя нас ад XVII з'езда, напоўнены велізарнымі падзеямі, слаўнымі справамі, выдатнымі подвігамі большэвікоў, партыйных і непартыйных. Цесна згуртаваны вакол таварыша Сталіна, цвёрда і непахісна ідзе наш народ па ленінскаму шляху. Цвёрда і непахісна вядзе яго партыя Леніна—Сталіна, партыя, узброеная рэволюцыйнай тэорыяй, моцная адзінствам сваіх радоў, загартаваная ў баях, мудрая вопытам, бясстрашная ў барацьбе. Няма той крэпасці, якую не ўзялі-б большэвікі, няма тых перашкод, перад якімі яны-б адступілі!

XVII з'езд партыі збіраўся ў пачатку другой пяцігодкі. Прадстаяла каласальная работа, меўшая велізарнае гістарычнае значэнне. Трэба было правесці поўнае тэхнічнае пераўзбраенне ўсіх галін прамысловасці, значна павялічыць прамысловую прадукцыю, завяршыць у асноўным механізацыю сельскай гаспадаркі, узняць абаронную магутнасць краіны. Новая тэхніка патрабавала абучаных кадраў для дасягнення ўсё больш высокай прадукцыйнасці працы.

Пад кіраўніцтвам сталінскага Цэнтральнага Камітэта наша партыя паспяхова справілася з гэтымі задачамі. Другі пяцігадовы план выканан поўнасцю, як і першы. Па ўзроўню валавой прадукцыі прамысловасці СССР заняў першае месца ў Еўропе і другое ў свеце. Няма цяпер такіх машын, якіх мы не змаглі-б вырабляць самі, на заводах СССР. Па машынабудаўніцтву, — а гэта ключ да рэканструкцыі ўсіх іншых галін прамысловасці,— мы займаем першае месца ў Еўропе і другое ў свеце. Па вытворчасці электраэнергіі, чыгуна СССР вышаў на другое месца ў Еўропе і на трэцяе ў свеце. Задача — дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя дзяржавы — вырашаецца паспяхова і напэўна будзе вырашана. Удзельная вага соцыялістычных форм гаспадаркі ва ўсім народным даходзе складае цяпер 99,1 проц., у валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці — 99,8 проц., у валавой прадукцыі ўсёй сельскай гаспадаркі — 98,6 проц. і ў рознічным тавараабароце — 100 проц. Вось непахісная аснова нашых перамог, вось што дае нам упэўненасць у барацьбе! Клопатамі таварыша Сталіна СССР стаў магутнай соцыялістычнай дзяржавай, краіна адзета ў броню, аб якую абламаюць сабе зубы фашысцкія псы.

Толькі ў нашай краіне, і толькі на аснове перамог соцыялізма мог узнікнуць магутны стаханаўскі рух, які падрыхтоўвае ўмовы для пераходу ад соцыялізма да комунізма. Стаханаўскі рух з'явіўся яркім выражэннем таго, што наша рэволюцыя дала народу не толькі палітычную свабоду, але і матэрыяльныя ўмовы для заможнага жыцця.

Велізарныя змены адбыліся і ў сельскай гаспадарцы. Да моманту XVII з'езда ў МТС і соўгасах налічвалася 204.000 трактароў. Цяпер іх стала ўжо звыш 500.000! Камбайнаў у МТС тады было 11,5 тысячы, а цяпер ёсць 150 тысяч камбайнаў. 7—8 мільярдаў пудоў зерна—гэта ўжо рэальнасць бліжэйшага года — двух. Разам з кулацкай кабалой канулі ў вечнасць беднасць і галеча ў вёсцы. Калгаснае сялянства ўпэўнена ідзе да заможнага жыцця, калгасы сталі для селяніна блізкімі, роднымі. На прыкладзе перамогі калгаснага ладу можна бачыць найвялікшую жыццёвую сілу марксізма-ленінізма. Партыя пераможна ажыццявіла сталінскі план калектывізацыі таму, што яна кіравалася перадавой рэволюцыйнай тэорыяй, яна смела ўзялася за гэтае беспрыкладнае рэволюцыйнае пераўтварэнне, была ўпэўнена ў перамозе і перамагла.

Грандыёзныя перамогі соцыялістычнай эканомікі за мінуўшае пяцігоддзе дасягнуты ў той час, калі за рубяжамі нашай радзімы, у краінах капіталізма, прамысловасць і сельская гаспадарка ўноў, пасля невялікай перадышкі, сапраўдаюцца ў цісках эканамічнага крызіса. Няўхільны, бесперапынны рост прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў нас, у краіне соцыялізма, падзенне прамысловай прадукцыі і прадукцыі сельскай гаспадаркі ў краінах капіталізма—такі ітог спаборніцтва двух сістэм.

Прайшоўшае пасля XVII з'езда пяцігоддзе было перыядам далейшага росквіту соцыялістычнай культуры, мастацтва, навукі. СССР стаў краінай самай перадавой культуры. Будаўніцтва тысяч новых школ, вышэйшых навучальных устаноў, тэатраў і клубаў, нябачаныя тыражы газет і кніг — вось чым характэрны гэты перыяд для культурнага ўздыму, сапраўднай культурнай рэволюцыі, якая адбываецца ў нашай краіне. Выбары ў Акадэмію навук, дзесяткі розных навуковых з'ездаў, канферэнцый, кангрэсаў, што праходзяць у нашай краіне, трыумфальныя паездкі людзей совецкага мастацтва за граніцу і многа, многа іншых фактаў паказваюць перад усім светам, якога высокага ўзроўню дасягнула культура ў СССР. І гэта ў той час, як у краінах капіталізма закрываюцца універсітэты, тэатры, школы, а ў краінах фашызма на кастрах спальваюцца творы лепшых умоў чалавецтва. У нас — росквіт навукі, культуры, мастацтва, у іх—невуцтва, варварства, вандалізм.

Буйнейшай падзеяй прайшоўшага перыяда, ітогам пройдзенага шляху з'явілася ўсенароднае абмеркаванне і прыняцце Сталінскай Канстытуцыі, на старонках якой запісана тое, што ўжо трывала заваявана, што стала здабыткам народа. Сталінская Канстытуцыя—гэта залатая кніга перамог соцыялізма. У гэтай кнізе народ запечатлеў свае вялікія правы, здабытыя ў тытанічнай барацьбе з сіламі старога свету.

«VIII з'езд Советаў аднадушна адобрыў і зацвердзіў праект новай Канстытуцыі СССР.

Краіна Советаў атрымала, такім чынам, новую Канстытуцыю, Канстытуцыю перамогі соцыялізма і рабоча-сялянскай дэмакратыі.

Тым самым Канстытуцыя замацавала той сусветна-гістарычны факт, што СССР уступіў у новую паласу развіцця, у паласу завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комуністычнага грамадства, дзе кіруючым пачаткам грамадскага жыцця павінен быць комуністычны прынцып: «Ад кожнага—па яго здольнасцях, кожнаму—па яго патрэбнасцях». (Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»).

З прынцыпам Канстытуцыі яшчэ больш умацавалася совецкая дзяржаўнасць, аснованая на дружбе народаў, на актыўным удзеле кожнага грамадзяніна ў кіраванні дзяржавай. Совецкі дзяржаўны карабль упэўнена ідзе па ленінска-сталінскаму курсу—да комунізма.

У Сталінскай Канстытуцыі адлюстрован той сусветна-гістарычнага значэння факт, што сціраюцца класавыя грані паміж працоўнымі СССР, знікае старая класавая выключнасць, падаюць і сціраюцца эканамічныя і палітычныя супярэчнасці паміж рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй. Усё гэта стварыла аснову маральна-палітычнага адзінства народа, якое з асаблівай сілай выявілася ў дні выбараў у Вярхоўны Совет СССР і ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Рэспублік. Галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, грамадзяне нашай радзімы галасавалі за палітыку большэвіцкай партыі. за Сталіна, за комунізм.

«Маральна-палітычнае адзінства народаў у нашай краіне, — гаварыў таварыш Молатаў у дакладзе, прысвечаным 20-годдзю Кастрычніцкай рэволюцыі, — мае і сваё жывое ўвасабленне. У нас ёсць імя, якое стала сімвалам перамог соцыялізма. Гэта імя разам з тым сімвал маральнага і палітычнага адзінства совецкага народа. Вы ведаеце, што гэта імя — Сталін!»

Маральна-палітычнае адзінства совецкага народа з усёй сілай сказалася і ў тым аднадушным падтрыманні, якое аказалі працоўныя нашай партыі ў барацьбе са злейшымі ворагамі народа — трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі і забойцамі.

На XVII з'ездзе партыі таварыш Сталін папярэджваў аб небяспецы супакаення і зазнайства.

«...Не ўбаюкваць трэба партыю,—гаварыў ён, — а развіваць у ёй пільнасць, не ўсыпляць яе, — а трымаць у стане баявой гатоўнасці, не разззбройваць, а ўзбройваць, не дэмабілізоўваць, — а трымаць яе ў стане мабілізацыі для ажыццяўлення другой пяцігодкі».

Таварыш Сталін многа разоў указваў на тое, што наша краіна знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, што ворагі знаходзяць сабе падтрыманне сярод асколкаў разбітых контррэволюцыйных партый, груп і групачак, што трэба заўсёды трымаць порах сухім.

Забойства незабыўнага Сергея Міронавіча Кірава, далейшыя падзеі раскрылі злачынскія планы бухарынскіх, рыкаўскіх, зіноўеўскіх і іншых фашысцкіх катаў. Гэта банда сплялася ў адзін брудны, крывавы клубок платных шпіёнаў, тэрарыстаў, дыверсантаў і шкоднікаў, засылаемых у нашу краіну замежнымі разведкамі.

У сваёй гістарычнай прамове на лютаўска-сакавіцкім 1937 года Пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін ускрыў метады падрыўной дзейнасці ворагаў народа і заклікаў усю партыю, увесь наш народ да ліквідацыі палітычнай бесклапотнасці. Прамова таварыша Сталіна адыграла велізарнейшую ролю ў барацьбе з ворагамі. Яна ўзброіла кожнага комуніста ясным разуменнем абстаноўкі капіталістычнага акружэння. Пад кіраўніцтвам партыі совецкі народ ускрыў многія шпіёнскія гнёзды, выкрыў агентаў фашысцкіх разведак, якія прабавалі ўдарам у спіну сразіць наш народ і аддаць яго пад ярмо капіталізма. Совецкі народ растаптаў белагвардзейскіх казявак! Знішчэнне трацкісцка-бухарынскай банды — вялікая перамога партыі, роўная выйгрышу ў вайне.

Партыя большэвікоў за прайшоўшыя пяць год, як і ў папярэднія годы пасля выгнання з совецкай зямлі белагвардзейцаў і інтэрвентаў, забяспечвала мірную працу народам СССР. Гэта—рэзультат мудрай палітыкі ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта, які ў складанейшай міжнароднай абстаноўцы, ва ўмовах пачаўшайся другой імперыялістычнай вайны адважна і рашуча вядзе вялікі совецкі карабль праз усе рыфы і падводныя камні, вядзе да комунізма. Японская ваеншчына, як вядома, прабавала ў жніўні мінулага года прашчупаць нас штыком. Ва ўсіх у памяці дні баёў ля возера Хасан, дзе наша героічная Чырвоная Армія паказала сваю самаадданасць і непахісную рашымасць выканаць дырэктыву таварыша Сталіна і ні аднаго вяршка совецкай зямлі нікому не ўступаць. Увесь свет быў сведкай пастыднага паражэння японскай ваеншчыны. Так будзе з усякім ворагам, які паспрабуе напасці на нашы рубяжы!

Таварыш Сталін з усёй сілай падкрэсліў значэнне совецкай дзяржавы з яе арміяй і разведкай. Мы будзем і надалей мацаваць дзяржаўную і ваенную магутнасць СССР. Ні на адну мінуту мы не павінны забываць таго, чаму вучыў нас Ленін, чаму вучыць нас таварыш Сталін.

«Мы акружаны людзьмі, класамі, урадамі, — гаварыў Ленін, — якія адкрыта выражаюць нянавісць да нас. Трэба помніць, што ад усякага нашэствія мы заўсёды на валаску».

«Трэба ўвесь наш народ, — вучыць таварыш Сталін, — трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...»

У апошнія годы партыя вылучыла на кіруючыя пасты дзесяткі і сотні тысяч маладых таленавітых работнікаў. Гэта — рэзультат вялікай выхаваўчай работы, праробленай партыяй, гэта—паказальнік маштабаў будоўлі, патрабуючай усё новых і новых сіл. «Павелічэнне глыбіні захвату гістарычнага дзеяння звязана з павелічэннем колькасці гістарычна дзейснай масы» (Маркс). Вылучэнне новых кадраў — лепшы паказальнік таго, што талентаў у нашым народзе — каласальныя, невычэрпальныя крыніцы.

Барацьба партыі за пабудову соцыялізма абагаціла марксісцка-ленінскую тэорыю, якая, як сапраўдная навука, неадлучна ад практыкі, бесперапынна развіваецца і ўдасканальваецца, не баючыся замяняць асобныя ўстарэўшыя палажэнні і вывады новымі палажэннямі і вывадамі, адпавядаючымі новым гістарычным умовам.

Выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», у якім падведзен і абагулен вопыт барацьбы большэвіцкай партыі, дзе паказан марксізм-ленінізм у дзеянні, на практыцы соцыялістычнага будаўніцтва, з'явіўся вялікай падзеяй у ідэйным жыцці партыі. Сярод нашых кадраў, — а гэта кніга ў першую чаргу накіравана да нашай совецкай інтэлігенцыі, — пачаўся сур'ёзны паварот да вывучэння і далейшага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі. Рэволюцыйная тэорыя і рэволюцыйная практыка ўзаемна абагачаюць адна другую. Авалоданне большэвізмам, ідэалагічная загартоўка нашых кадраў — вось што нам трэба для таго, каб яшчэ больш паспяхова весці барацьбу за комунізм.

Такавы некаторыя ітогі апошніх пяці год. Адметнай рысай большэвіцкай партыі з'яўляецца тое, што яна ніколі не спыняецца на дасягнутым, ніколі не баіцца падняць руку на старое, аджываючае, а нязменна прадаўжае ісці ўперад, імкнучыся да новых поспехаў, да новых перамог. Парадак дня XVIII партыйнага з'езда адлюстроўвае гэта поўнасцю.

Рашэннем Пленума ЦК ВКП(б) парадак дня XVIII з'езда партыі ўстаноўлен наступны:

1. Справаздачныя даклады: ЦК ВКП(б) — дакладчык таварыш Сталін, Цэнтральнай рэвізійнай камісіі—дакладчык тав. Владзімірскі, дэлегацыі ВКП(б) у ВККІ—дакладчык тав. Мануільскі.

2. Трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР — дакладчык тав. Молатаў.

3. Змены ў статуце ВКП(б) — дакладчык тав. Жданаў.

4. Выбары камісіі па змяненню праграмы ВКП(б).

5. Выбары Цэнтральных органаў партыі.

Ва ўсіх партыйных арганізацыях цяпер пачынаецца падрыхтоўка да З'езда. Дні падрыхтоўкі да З'езда павінны стаць днямі мабілізацыі сіл працоўных на барацьбу за новыя вытворчыя поспехі ў прамысловасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Няма сумнення, што рабочыя, калгаснікі, совецкая інтэлігенцыя сустрэнуць XVIII з'езд ВКП(б) новым вытворчым уздымам, новымі перамогамі — падарункамі З'езду, 1939 год — год, у якім збіраецца XVIII з'езд партыі, — павінен стаць годам далейшых слаўных перамог соцыялізма!

Сільная і маналітная, моцна згуртаваная вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта, верная прынцыпам пролетарскага інтэрнацыяналізма, ідзе наша партыя да свайго XVIII з'езда. Пад сцягам Леніна — Сталіна партыя дабілася сусветна-гістарычных перамог соцыялізма. Пад сцягам Леніна — Сталіна яна вядзе наш народ уперад, да поўнага торжаства комунізма.

(Перадавы «ПРАВДЫ»).

ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ВКП(б)

Рашэннем Пленума ЦК ВКП(б) адкрыццё чарговага XVIII з'езда ВКП(б) назначана на 10 сакавіка 1939 года.

ПАРАДАК ДНЯ XVIII З'ЕЗДА:

1. Справаздачныя даклады: ЦК ВКП(б) — дакладчык т. СТАЛІН, Цэнтральнай рэвізійнай камісіі — дакладчык т. ВЛАДЗІМІРСКІ, дэлегацыі ВКП(б) у ВККІ — дакладчык т. МАНУІЛЬСКІ.

2. Трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР — дакладчык т. МОЛАТАЎ.

3. Змены ў статуце ВКП(б) — дакладчык т. ЖДАНАЎ.

4. Выбары камісіі па змяненню праграмы ВКП(б).

5. Выбары цэнтральных органаў партыі.

НОРМА ПРАДСТАЎНІЦТВА І ПАРАДАК ВЫБАРАЎ:

1) 1 дэлегат з рашаючым голасам на 1.000 членаў партыі.

2) 1 дэлегат з дарадчым голасам на 2.000 кандыдатаў у члены партыі.

3) Выбары праводзяцца закрытым (тайным) галасаваннем на абласных, краявых партыйных канферэнцыях і з'ездах нацкомпартый. Ва украінскай, беларускай, казахстанскай і узбекістанскай партарганізацыях выбары дэлегатаў на з'езд праводзяцца на абласных партыйных канферэнцыях.

4) Комуністы, якія састаяць у партыйных арганізацыях Чырвонай арміі, Ваенна-Марскога флота і часцей НКВД, праводзяць выбары дэлегатаў на XVIII з'езд разам з астатнімі партыйнымі арганізацыямі на абласных, краявых партканферэнцыях або з'ездах нацкомпартый.

Сакратар ЦК ВКП(б) І. СТАЛІН.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

25 — 27 студзеня 1939 года адбыўся IV пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, гаркомаў і райкомаў КП(б)Б.

Пленум абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Даклад Наркамзема БССР тав. Кулагіна аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы 1939 года.

2. Даклад сакратара Магілеўскага абкома КП(б)Б тав. Маліна аб выкананні ў калгасах Магілеўскай вобласці статута сельскагаспадарчай арцелі.

3. Даклады сакратароў Гомельскага і Віцебскага абкомаў КП(б)Б тт. Жыжэнкова і Стулава аб ходзе выканання пастановы ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Па ўсіх гэтых пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні. Апрача таго, пленум прыняў рашэнні аб падрыхтоўцы да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года і аб ходзе выканання дзяржаўных абавязацельстваў.

Пленум выбраў другім сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Кальцова П. А.

Пленумам аслабанены ад абавязкаў члена бюро ЦК КП(б)Б тав. Рэпінскі М. Я. і ад абавязкаў кандыдатаў у члены бюро ЦК КП(б)Б тт. Кавалькоў І. Д., Якушэва Т. І.

Пленум выбраў тав. Кулагіна М. В. членам бюро ЦК КП(б)Б і тав. Масленнікава І. І. кандыдатам у члены бюро ЦК КП(б)Б.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЛКСМБ

XIII з'езд комсамола Беларусі адкрываецца 7 лютага 1939 года ў 6 гадзін вечара ў памяшканні Яўрэйскага тэатра БССР.

ПАВЕСТКА ДНЯ XIII З'ЕЗДА:

1. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ. 2. Справаздача рэвізійнай камісіі. 3. Выбары ЦК ЛКСМБ. 4. Выбары рэвізійнай камісіі.

Сакратар ЦК ЛКСМБ В. ГАЛОЎКІН.

ДЭЛЕГАЦЫЯ РАБОТНІКАЎ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА БССР У МАСКВЕ

29 студзеня ў Маскву прыехала дэлегацыя пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, артыстаў і скульптараў Беларускай ССР для ўдзелу ў вечарах беларускай літаратуры, якія арганізоўваюць у Маскве Саюз совецкіх пісьменнікаў СССР і Усесаюзны Камітэт па справах мастацтваў пры СНК Саюза ССР.

У складзе дэлегацыі: народныя паэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас, паэты П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, З. Аксельрод, Г. Камянецкі, Э. Агняцвет, пісьменнікі З. Бядуля, К. Крапіва, М. Клімковіч, І. Гурскі, І. Шапавалаў, М. Паслядовіч, Я. Маўр, А. Кучар, заслужаны дзеяч мастацтва З. Азгур, мастакі В. Волкаў, Н. Пашкевіч, народная артыстка рэспублікі Л. Александроўская, заслужаныя артысты рэспублікі М. Дзянісаў, І. Балоцін, артыстка Руч'ёва, кампазітары Любан і Шчэглоў. Усіх прыехала каля 30 чалавек.

На Беларускім вакзале дэлегацыю сустракалі маскоўскія паэты і пісьменнікі: А. Фадзееў, В. Вішнеўскі, П. Пауленка, К. Трэнёў, А. Суркоў, В. Катаеў, Л. Нікулін, В. Бахмецьеў і іншыя.

У акружэнні маскоўскіх пісьменнікаў беларуская дэлегацыя з вакзала накіравалася ў Маскоўскі клуб пісьменніка, дзе адбыўся таварыскі прыём. Тт. Фадзееў і Якуб Колас абмяняліся кароткімі прывітальнымі прамовамі.

Учора адбыўся першы вечар беларускай літаратуры ў Доме пісьменніка.

БОЛЬШ УВАГІ РУСКІМ ПІСЬМЕННІКАМ БЕЛАРУСІ

Новае, соцыялістычнае грамадства на нашай зямлі ўзнікла, дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, у жорсткай і бязлітаснай барацьбе рускага пролетарыята супроць прыгнятальнікаў. Вялікі рускі народ дапамагаў шматлікім народам, насяляючым б. Расійскую імперыю, скінуць са сваёй шыі ярмо капіталістычнага гнёту, дапамагаў совецкім рэспублікам будаваць соцыялістычнае грамадства. З асяроддзя рускага народа выйшлі вялікія барацьбіты і мысліцелі, вялікія пісьменнікі і вучоныя.

Руская культура выкоўвалася на працягу многіх вякоў у барацьбе з прыгнятальнікамі. Пушкін і Лермантаў, Некрасаў і Гогаль, Белінскі і Дабралюбаў, Герцэн і Чэрнышэўскі — вось тыя людзі, творчасць якіх увасабляе сабою скарбніцу рускай культуры, якая служыла і служыць невычарпальнай крыніцай для ўзбагачэння культур нацыянальных совецкіх рэспублік.

Руская мова — гэта мова вялікага народа, які стварыў самую багатую ў свеце соцыялістычную культуру з яе вышэйшым дасягненнем — ленінізмам. Да рускай мовы, як да мовы твораў Леніна і Сталіна, звяртаюцца перадавыя людзі не толькі народаў Совецкага Саюза, але і працоўныя ўсяго свету. Руская мова стала міжнароднай мовай соцыялістычнай культуры.

Яшчэ ў 1875 годзе Энгельс пісаў: «Веданне рускай мовы, — мовы, якая ўсямерна заслугоўвае вывучэння як сама па сабе, бо гэта адна з самых моцных і самых багатых жывых моў, так і дзеля раскрываемай ёю літаратуры, цяпер ужо не такая рэдкасць». (Творы, т. XV, стар. 238).

Буржуазныя нацыяналісты ў саюзе з трацкісцка-бухарынскімі здраднікамі, забойцамі і шпіёнамі спрабавалі адгарадзіць рускую культуру, рускую мову ад народаў совецкіх рэспублік. Яны ведалі, што народы рэспублік, чэрпаючы багацці з рускай культуры, развіваючы на яе аснове сваю культуру, стануць яшчэ больш палітычна свядомымі, яшчэ больш адточаць сваё светаразуменне.

У Совецкай Беларусі дзейнасць лютых ворагаў народа была накіравана да таго, каб адарваць беларускія тэатры, беларускую літаратуру, беларускае мастацтва — наогул усю беларускую культуру ад уплываў рускай культуры.

Беларускі чытач заўсёды меў вялікую цягу да твораў рускіх пісьменнікаў. Камандзіры, палітработнікі і байцы часцей Чырвонай Арміі, размешчаных на тэрыторыі БССР, заўсёды адчувалі патрэбнасць у рускай літаратуры, цікавіліся творчасцю беларускіх совецкіх пісьменнікаў. Але, не гледзячы на гэта, у БССР не выходзіла ні аднаго рускага журнала, не выдавалася твораў беларускіх совецкіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую мову.

Узначальваемае ў недалёкім мінулым ворагам народа кіраўніцтва ССП БССР перашкаджала рускім пісьменнікам рэспублікі ў іх літаратурнай працы, тармазіла іх творчы рост. Рускія пісьменнікі БССР былі пазбаўлены ўсякай магчымасці друкаваць свае творы. Па загаду агіднага ворага народа была таксама ліквідыравана абаронная секцыя ССП БССР, якая аб'ядноўвала чырвонаармейскіх пісьменнікаў.

Вялікі совецкі народ пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў разграміў фашысцкія гнёзды, пролетарскім мячом адсек галовы ядавітым змеям.

Але вынікі шкодніцтва ў адносінах рускай мовы, рускіх пісьменнікаў БССР да гэтага часу яшчэ поўнасцю не ліквідыраваны.

Да гэтага часу як з боку ССП БССР, так і з боку Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі і Радыёкамітэта яшчэ не зжыты роўнадушнасць і абыякавасць да рускай мовы, да рускай культуры.

Здаўна існуе дагаворанасць з Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі аб выданні штогод чатырох альманахаў рускай секцыі ССП БССР, але за чатыры годы выдавецтва выпусціла ў свет толькі адзін альманах. Адносна работы Белдзяржвыдавецтва з рускімі аўтарамі і гаварыць не прыходзіцца— работы ніякай няма.

Не гледзячы на тое, што да кіраўніцтва ССП БССР прышлі новыя людзі, належнай увагі да рускіх пісьменнікаў Беларусі з боку праўлення ССП БССР няма. Да апошняга часу рускія пісьменнікі працуюць без усякай дапамогі. На працягу двух год праўленне не арганізавала ні аднаго вечара рускіх пісьменнікаў. У літгабінеце нават няма літкансультанта, які-б добра ведаў рускую мову.

У канцы мінулага года Палітупраўленне БАВА склікала акруговую нараду чырвонаармейскіх пісьменнікаў, на якой з дакладамі аб іх творчасці выступалі беларускія пісьменнікі і крытыкі. На нарадзе выявілася, што сярод пачынаючых чырвонаармейскіх пісьменнікаў ёсць досыць здольныя людзі, — напрыклад, тт. Слесараў, Іваноў, Караткевіч, Остроўскі і інш., якія пры кваліфіцыраванай дапамозе ССП БССР могуць стаць добрымі майстрамі пяра. Прайшла нарада, і ўсё забылася. Да гэтага часу з чырвонаармейскімі пісьменнікамі праўленне ССП БССР сувязі не наладзіла.

Цікава адзначыць панічны жах Беларускага радыёкамітэта перад рускай мовай. Неаднаразова радыёслухачы, асабліва камандзіры і чырвонаармейцы, патрабавалі ад Радыёкамітэта рускіх перадач, неаднаразова рускія пісьменнікі прапанавалі свае паслугі ў гэтай галіне, але Радыёкамітэт насустрач гэтаму не пайшоў— маўляў, мы перш за ўсё Беларускі радыёкамітэт, мы маскоўскіх пісьменнікаў і то перадаем вельмі рэдка. Больш таго, заяўкі радыёслухачоў на перадачу на рускай мове твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку народных паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа, пакінуты Радыёкамітэтам без усякай увагі.

У выніку ўсяго гэтага каля 30-ці даволі здольных аўтароў,—напрыклад, тт. Левіна, Слесараў, Іваноў, А. Остроўскі, Н. Остроўскі, Караткевіч і шмат іншых, якія пішуць на рускай мове, — з Саюзам совецкіх пісьменнікаў не звязаны. У некаторых з гэтых аўтароў напісана шмат твораў, але яны трымаюць іх у скрынках пісьмовых сталоў, бо няма дзе друкаваць.

Ці не пара пакончыць з пагардлівымі адносінамі да рускіх пісьменнікаў Беларусі? Ці не пара праўленню ССП БССР паклапаціцца аб арганізацыі рускай секцыі не толькі на паперы, але і на справе?

Зараз перад праўленнем Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР устае рад неадкладных задач па арганізацыі і ўмацаванню рускай секцыі, па ахопу рускіх аўтароў і аказанню ім сталай дапамогі. Неабходна таксама паставіць пытанне перад выходзячымі ў БССР рускімі газетамі аб перыядычным друкаванні твораў рускіх пісьменнікаў; неабходна паставіць пытанне аб стварэнні штомесячнага рускага журнала, у якім маглі-б друкавацца не толькі творы рускіх пісьменнікаў, але і лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую мову.

Чырвонаармейскія пісьменнікі, якія прадстаўляюць большасць рускіх пісьменнікаў у БССР, амаль усе свае творы прысвячаюць абароннай тэматыцы, а таму неабходна неадкладна аднавіць абаронную секцыю, арганізаваць яе так, каб яна з'яўлялася арганізуючым цэнтрам абароннай літаратуры ў БССР.

Для таго, каб павысіць якасць твораў рускіх пісьменнікаў, неабходна паставіць на належную вышыню пытанні творчай вучобы — арганізацыю дэкаднікаў рускіх пісьменнікаў з выклікам аўтароў з перыферыі, арганізацыю вечароў асобных аўтароў.

Радыёкамітэт не павінен адмаўляцца ад арганізацыі вечароў рускіх пісьменнікаў, ад перадачы на рускай мове твораў лепшых беларускіх пісьменнікаў.

Ствараць для вялікага совецкага народа высокамастацкія творы — што можа быць вышэй, удзячней і благародней гэтай задачы! Вялікае шчасце тварыць на карысць усяго працоўнага чалавецтва, на карысць адзінаццаці рэспублік, якія з'яднаны ў радасны, шчаслівы саюз і імкнуцца ў адзіным нястрымным парыве да агульнага шчасця, імя якому—комунізм!

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ПАЭЗІІ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Прафесар М. К. ДАБРЫНІН

І дзень ідзе, і ноч ідзе.
І галаву схапіўшы ў рукі,
Здзіўляешся, чаму не йдзе
Апостал праўды і навукі!

І.

ЗАМУЧАНЫ прыгонніцка-бюракратычным рэжымам, Т. Г. Шэўчэнка ўсё сваё жыццё **страсна марыў аб волі, аб свабодзе.** Спачатку гэта была мара няясная, неакрэсленая, адно страснае імкненне да свабоды. Потым яна напаўняецца пэўным зместам рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару. У такім плане павінны быць зразуметы і раннія матывы творчасці паэта, т. зв. рамантычныя. Рамантыка Шэўчэнка — рэвалюцыйная, і ў гэтых адносінах ён блізкі да рамантыкі дзекабрыстаў. Невыпадкова паэт успамінае сваіх братоў у камедыі «Сон». Дух паэта наведвае далёкую Сібір, дзе пакутуюць зняволеныя.

То не трупы, то не суду
Просяць ад пакуты;
Не, жывыя гэта людзі,
У кайданы закуты,
З нораў золата выносяць,
Каб горла, як скрутам,
Ненасытнаму заткнуці.
Катаржане_гэта!
А завошта? Хіба знае
Усемагутны... Дзе там!

І праз шмат год Шэўчэнка зноў вяртаецца да гэтай-жа тэмы, зноў выводзіць на свет пакутнікаў за волю.

... А я памчуся на Сібір
Аж за Байкал: загляну ў горы,
У вярцепы цёмныя і ў норы,
Без дна глыбокія. І вас,
Барацьбіты святое волі,
Ад цемры, чаду і няволі
Царам, людзям я на паказ,
На свет вас выведу надалей
Радамі доўгімі ў кайданах.

Нават зварот Шэўчэнка да мінулага, да гісторыі носіць такі-ж характар, як у дзекабрыстаў. Шэўчэнка, як і Рылееў, гаворыць аб свабодзе Украіны, аб яе барацьбе з палякамі за сваю незалежнасць. У паэме «Гайдамакі» Шэўчэнка выкарыстоўвае гістарычны сюжэт у тым-жа духу, як Рылееў выкарыстаў у сваіх думах факты з гісторыі Украіны і Расіі для раскрыцця адной асноўнай мыслі—барацьбы за свабоду. Было-б няправільным шукаць гістарычнай праўды ў «Гайдамаках» і на гэтай аснове судзіць паэта. Але будзе зусім правільна, калі мы ўбачым у паэме адлюстраванне бунтарскага духу Шэўчэнка, павернутага ў мінулае, каб выказаць свой пратэст супроць гнуснага гнёту сучаснасці, свае думы аб неабходнасці жорсткай расправы з прыгнятальнікамі. Паэма «Гайдамакі» ёсць заклік да паўстання, да барацьбы супроць усякага прыгнечання, заклік да свабоды, да волі.



Да выдання «Кабзара» на беларускай мове. Ілюстрацыя мастака **В. Каплана**—студэнта Ленінградскай акадэміі мастацтваў.

Пазней, калі Шэўчэнка стаў рэалістам, ён пачынае расцэньваць гістарычных дзеячоў з пункту погляду гістарычнага лёсу Украіны. Яму зразумела ісціна, што царская Расія—турма народаў, і ён марыць пра той час, калі Украіна паўстане супроць сваіх прыгнятальнікаў. Ён марыць пра той час, калі на месцы турмы народаў будзе свабодны саюз народаў. У паэме «Каўказ» найбольш ярка выказаны мысль аб царскай Расіі, як турме народаў, і мара Шэўчэнка аб свабодзе і братэрстве. Пачынаецца твор вобразам Праметэя, якому ўдзень і ўночы арол

Сэрца разбівае;
Разбівае, ды не вып'е
Крыві жывой з сэрца, —
Ізноў яно ажывае,
Ды ізноў смяецца.

Шмат загінула рускіх салдатаў, шмат загінула горцаў, —

А слёз, крыві? Усіх напаіць
Тут імператараў-бы стала,
З дзяцьмі і ўнукамі ўтапіць
У ўдовіх слёзах...

Але паэт верыць, што прачнецца праўда на зямлі і падымуцца да вольнага жыцця народы. Гэта мара Шэўчэнка збылася, усе народы нашай радзімы сышліся ў дружную совецкую сям'ю. Гэтыя матывы барацьбы за свабоду, мары Шэўчэнка аб братэрстве народаў блізкія нам. Вельмі ярка і моцна гучыць яго «Заповіт»:

Як памру, дык пахавайце
Мяне на кургане,
Сярод стэпу шырокага
На Украіне слаўнай.
. . . .
Пахавайце ды ўставайце,
Ланцугі парвіце,
І варожай злой крывёю
Волю акрапіце!
І мяне ў сям'і вялікай,
У сям'і вольнай, новай,
Памянуць вы не забудзьце
Нязлым, ціхім словам!

Адзначаючы юбілей вялікага народнага паэта, народы Совецкага Саюза тым самым выконваюць «Заповіт» Шэўчэнка, успамінаюць яго ў новай, вольнай сям'і народаў Совецкага Саюза «нязлым, ціхім словам».

II.

Мара аб волі, аб свабодзе пераплятаецца ў Шэўчэнка з гарачым заклікам да барацьбы супроць прыгнятальнікаў. Колькі злабы, колькі нянавісці і агіды ўліў паэт у свае вершы, якія громяць паноў і іншых прыгнятальнікаў. Усе яны, пачынаючы з нябеснага і зямнога цара, варты агіды і самай бязлітаснай кары. Дзе-ж бог усемагутны і справядлівы, калі навакол столькі зла, гора і пакут чалавечых. Куды-ж глядзела «усёбачачае вока», калі святых пакутнікаў за праўду гналі ў Сібір? — піша Шэўчэнка.

А ты, усёвідзячае вока!
Ці ты заўважыла звысоку,
Як сотнямі ў кайданах гналі
У Сібір нявольнікаў святых,
Як мардавалі, распіналі
І вешалі? А ты не знала?
І ты ўзіралася на іх
І не аслепла?! Вока! Вока!
Не дужа бачыш ты глыбока!

Шэўчэнка дайшоў да той мыслі, што нябесны пан—бог служыць зброяй у руках зямных паноў—цароў і памешчыкаў. Яны разам закавалі і замуравалі ўвесь свет, і Шэўчэнка заклікае да барацьбы супроць рэлігіі і царквы. Бог, рэлігія, царква, папы закавалі і замуравалі людзей, пранікнулі ва ўсе іх ўзаемаадносіны і атруцілі жыццё. Асабліва цяжка адбівалася апека царквы ў галіне сямейных адносін, дзе царква бесцэрамонна ўмешвалася ў найінтымнейшае жыццё людзей. Удала выказаў гэтыя мыслі Шэўчэнка ў «Глікерыі»:

Мая ты любая! Мой дружа!
Не мець нам веры без крыжоў,
Не мець нам веры без паноў,
Рабам, нявольнікам нядужым!
Заснулі, што свіння у лужы,
У сваёй няволі! Мой ты дружа,
Грудзей ніколі не жагнай,
У малітве воч не ўзнімай
Ніколі ў свеце. Збрэшуць людзі,
І візантыйскі Саваоф
Абдурыць. Не абдурыць бог, —
Караць і мілаваць не будзе:
Мы не рабы яго—мы людзі!

Сярод матываў гнеўнай, страснай барацьбы супроць нябеснага цара асоба ядавіта гучыць насмешка над ім у «Гімне чарніц». Шэўчэнка марыць пра той час, калі людзі не будуць прызнаваць нябеснага цара, не будуць рабамі, а будуць проста людзьмі на зямлі.

III.

Побач з нябесным царом падвізаюцца зямныя цары. Нямнога можна адшукаць паэтаў і пісьменнікаў, у якіх барацьба супроць цароў, супроць дэспатызма і самадзяржаўя прымала-б такую ярка выказаную форму нянавісці і пагарды. Шэўчэнка мог мець асабістую нянавісць да Нікалая І, які загубіў яго жыццё. Але не асабістыя матывы гучаць у яго паэзіі, а матывы сацыяльнай барацьбы. Голас задаўленых рабоў, голас мільёнаў прыгнечаных сялян гучыць у паэзіі Т. Г. Шэўчэнка. Пратэст Шэўчэнка гучыць ва ўнісон з паэзіяй рэвалюцыйных разначынцаў, з паэзіяй Некрасава, які заявіў:

Работаешь один,
А чуть работа кончена,
Глядишь, стоят три дольщика:
Царь, бог и господин.

Пратэст шматмільённых сялянскіх мас і адлюстроўваецца ў творах Шэўчэнка. У гэтым яго сіла і яго слабасць. Шэўчэнка не мае ніякіх ілюзій наконт цароў, і ў гэтым яго сіла. Цар, дзе-б ён ні быў, ёсць цар,—прыгнятальнік, дэспат, вораг, эксплаататар. Шэўчэнка рысуе нам цароў старажытнага Усходу і Нікалая І, знаходзячы ў іх шмат агульных рысаў. У творы «Цары» Шэўчэнка паказвае невідушчым людзям —

Каронай венчаных грамаду...
спераду і ззаду.

У пяці ўрыўках твора «Цары» ён рысуе разбэшчанага цара Давіда, які ў час бою —

У срэбнай рызе пахаджае
І, нібы кот той, пазірае
На сала, на зялёны сад
Суседа Гурыя...

Яму спадабалася Вірсавія, жонка Гурыя. Давід украў Вірсавію, а Гурыя загадаў забіць.

І зноў вясёлы, зноўку п'яны
Каля рабыні захадзіў.

Другі нарыс рысуе сына цара Давіда, Амона, які прыкінуўся хворым, каб сястра Фамар спякла пернік і сама прынесла хвораму. Калі, нічога не падазраваючы, Фамар прышла да яго, дык Амон гвалтам авалодаў сваёй сястрой.

Вось так царэвічы жывуць,
Дурэючы на свеце.

У трэцім нарысе—той-жа Давід, але настолькі знямогшы, што ніякія пакрывалы не саграваюць яго. З усёй зямлі сабралі да яго найпрыгажэйшых дзяўчат, каб яны сваімі целамі сагравалі «капішчу блуднага». Такія цары Усходу.

А вось славянскія цары. У чацвертым нарысе Шэўчэнка гаворыць аб кражы св. Уладзімірам дачкі Рагвалода, Рагнеды. Для гэтага спатрэбілася заваяваць і разбурыць Полацк, потым згвалтаваць Рагнеду і прагнаць яе.

Дык вось наколькі ў іх святога —
У тых царах.

Шэўчэнка не выдумляў, а браў факты з гісторыі і яны красамоўней і пераканальней за ўсякую выдумку рысавалі вобразы цароў.

Дадаткам да паэмы «Цары» служыць твор «Саул», у якім даецца не толькі вобраз разбэшчанага і прагнага цара, але і прыгнятальніка, які каршуном налятае на мірных працаўнікоў.

Рысуючы цароў Усходу і старажытнай Русі, Шэўчэнка бачыць агульныя рысы дэспатаў-самадзержцаў і такім чынам ускосна характарызуе сучасных яму цароў. У яго мы маем вобразы Пятра І, Нікалая І, Аляксандра II, ца-



рыцы Аляксандры Фёдараўны і інш.

Больш рэзка дадзен вобраз Нікалая, жорсткую палітыку якога Шэўчэнка адчуў на сабе. Нікалаеўская казарма, эпоха «моравай паласы» доўжылася трыццаць год і яна цяжка адбілася на Шэўчэнка. Нікалай І вылазіць як мядзведзь з бярлогі, крычыць, лаецца, гарланіць на сваю чэлядзь, на ўсіх блюдалізаў. Многа пакут перанёс Шэўчэнка ад цара і царыцы, многа зла бачыў ён ад іх для ўсяго грамадства. І ён іх пракляў:

Цябе-ж, о, сука!
І самі мы і нашы ўнукі
На свет ўвесь людзі праклянуць!
Не праклянуць, а толькі плюнуць
На тых абдоеных шчанят,
Што ты шчаніла. Мука! мука!
О смутак мой, мая журба,
Ці ты мінеш калі? Ці псамі
Цары з міністрамі-рабамі
Цябе такую зацкуюць!
Не зацкуюць! А людзі ціха,
Без жаднага ліхога ліха,
Цара да ката павядуць.

Калі-ж гэта будзе, калі праўда возьме верх і народ расправіцца з царамі? Калі-б людзі не поўзалі як рабы, дык былі-б братамі, і не панавалі-б цары. Шэўчэнка марыць пра гэты час, марыць —

Ці будзе суд? Ці будзе кара
Царам, царатам на зямлі?
Ці будзе праўда між людзьмі?..
Павінна быць, бо сонца стане
Зямлю спаганену паліць.

Шэўчэнка верыць у гэта і таму пытаецца ў людзей, навошта патрэбны ім цары?

О, людзі! людзі-небаракі!
Нашто здаліся вам цары?
Нашто здаліся вам псары?
Бо вы ўсё-ж людзі, не сабакі!

Толькі ў паэзіі Радзішчэва ды рэвалюцыйных сялянскіх дэмакратаў знаходзім мы падобныя характарыстыкі і матывы. Нянавісць, пагарда, прага пагібелі каранаваных злачынцаў, цароў-псароў з'яўляецца ў Шэўчэнка важнейшым матывам, матывам барацьбы за свабоду. Матывы царазабойства, барацьбы супроць дэспатызма і самадзяржаўя пераплятаюцца ў яго з матывамі барацьбы супроць нябеснага цара і зямнога пана-памешчыка. Цар, бог і пан—вось прыгнятальнікі, якім няма літасці, няма прабачэння.

Гэтак разгарнуў Шэўчэнка барацьбу супроць самадзяржаўя, дэспатызма і прыгонніцтва.

IV.

Барацьба супроць прыгнятальнікаў, супроць бога, цара і пана заўсёды спалучаецца з гарачай абаронай чалавека, прыгнечаных, мужыка, жанчыны, дзяцей. У гэтых матывах Шэўчэнка ўзнімаецца да агульначалавечых пачуццяў, да сапраўднага дэмакратычнага гуманізма. Паэт смуткуе аб тым, што, падпарадкуючыся царам, людзі страцілі сваю чалавечую годнасць, сталі жалкімі рабамі. Прага нажывы, зайздрасць, злаба раз'ядноўваюць людзей і робяць іх ворагамі.

Дзе-ж добрыя тыя людзі,
Што сэрца жадала
З імі жыці, іх любіці?
Прапалі, не стала!

Ад абароны чалавека наогул Шэўчэнка пераходзіць да абароны прыгонңага мужыка, казака, жанчыны—маці, жонкі, нявесты, да абароны дзяцей. У паэме «Гайдамакі» нарысаван вобраз аднаго з важакоў паўстання, Галайды, які да паўстання быў слугой:

— «Ярэма! гершту, хамскі сыне!
Пайдзі кабылу прывядзі.
Падай пантоплі гаспадыні,
Мне прынясі вады, ідзі!
Падмяці хату! Нясі дровы!
Пасып індыкам! Гусям дай!
Пайдзі ў абору, дай карове.
Ды хутка, хаме! Пачакай.
Зрабіўшы ўсё, бяжы ў Вільшану:
Яймосьці трэба. Не марудзь!».
Пайшоў Ярэма, йдзе чуць-чуць.

З выключнай шчырасцю і цеплынёй дадзены жаночыя вобразы ў паэзіі Шэўчэнка. У паказе іх Шэўчэнка—сапраўдны рэвалюцыйны дэмакрат. Жанчына для яго не прадмет для асалоды, а друг і таварыш, саратнік у барацьбе. Жанчына—маці, жонка, нявеста зарысаваны Шэўчэнка з выключнай любоўю і цеплынёй. Пачынаючы з вобраза Кацярыны з аднайменнай паэмы і Аксаны з паэмы «Гайдамакі», Шэўчэнка не здраджвае сабе ў абмалёўцы вобраза жанчыны да канца сваёй паэтычнай дзейнасці.

У гэтых адносінах мы знаходзім у яго шмат агульных рысаў з рэвалюцыйным дэмакратам Н. А. Некрасавым. Кацярына, ашуканая маскалём-афіцэрам, кінутая ім разам з дзіцянём, канчае жыццё самагубствам. З вялікай цеплынёй і сумам рысуе паэт вобраз гэтай няшчаснай жанчыны, з якой насмяяліся ўсе і ад якой усе адвярнуліся, уключаючы і роднага бацьку і маці. А што будзе з дзіцём, у якога няма бацькі ці, правільней, ад якога адмовіўся бацька!

Пад хатаю заначуем,
Сыне мой, Іване!
Дзе-ж ты будзеш начаваці,
Як мяне не стане?
З сабакамі, мой сыночку,
Дзялі сваё гора,—
Сабакі хоць пакусаюць,
Ды не загавораць,
Не раскажуць, смеючыся...
З сабакамі жыці...
Бедна-ж мая галовачка,
Ой, што мне рабіці?

Маці памірае, бацька адмаўляецца ад сына, сірата застаецца адзінокім на свеце.

Да гэтых вобразаў адносіцца і Аксана з паэмы «Гайдамакі». Яна таксама не ведае шчасця; бацьку забілі палякі, а яе ўзялі з сабой, каб надругацца над ёю. Пакуты бацькі і самой Аксаны пададзены не ў асабістым, а ў сацыяльным плане. Казакі жорстка помсцяць за ўсе свае пакуты і мучэнні, за смерць бацькі Аксаны і за здзекі над ёю. Шэўчэнка паказвае тут, як матывы асабістай помсты пераплятаюцца з барацьбой за свабоду і незалежнасць роднай краіны, супроць прыгнятальнікаў-палякаў.

Пытанне аб жанчыне і яе эмансіпацыі было адным з найбольш важных у шасцідзесятыя годы. Не дзіўна, што гэтаму пытанню так шмат увагі ўдзяляла паэзія рэвалюцыйных разначынцаў. У большасці паэтаў-разначынцаў ёсць вобразы жанчыны і сярод іх вобраз паўшай жанчыны. Некрасаў («Еду ль я ночью по улице темной», «Убогая и нарядная»), а следам за ім Дабралюбаў («Не насмехайтесь над падшей женой») і інш. зразумелі і не асудзілі такую жанчыну. Такіх-жа поглядаў трымаўся і Шэўчэнка.

Многа трэба было любві да чалавека і глыбока трэба было разумець сацыяльныя супярэчнасці, каб так думаць і адчуваць. Шэўчэнка стаіць тут у адным радзе з рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі — Чэрнышэўскім, Дабралюбавым, Некрасавым.

Цудоўны вобраз батрачкі Ганны з паэмы «Наймічка». Маладзіца нарадзіла сына і вырашыла падкінуць яго добрым людзям. Тыя ўзялі дзіця і сталі выхоўваць яго, а Ганна нанялася да іх у батрачкі, каб даглядаць свайго-ж уласнага сына. Мінулі годы, старая гаспадыня памёрла, прыёмны сын Марк вырас і ажаніўся. Ганна заставалася ў доме і яе як родную любілі Марк і яго жонка. Толькі перад смерцю Ганна прызналася Марку, што ён — яе сын. Усё жыццё пражыла яна для свайго сына, не маючы права сказаць, што яна яго маці. Пачынаецца паэма выдатным пралогам пра лёс дзіцяці:

Я не адна — у мяне ёсць
І бацька, і маці...
У мяне ёсць, туманочку,
Тумане, мой браце!..
Нехрышчоны мой сыночак,
Мой любы сакола,
Не я цябе хрысціць буду
На марную долю;
Не лай мяне! Я выпрашу
І вымалю ў бога
Долю, выплачу слязамі
Для сына малога!

І заключная карціна, дзе ў апошнюю хвіліну жыцця наймічка прызнаецца, што яна маці Марка, таксама напісана з выключным пачуццём.

Я не Ганна, не наймічка,
Я...
І занямела.
Марка плакаў і дзівіўся.
Зноў вочы адкрыла,
Пільна глянула, ды зрок ёй
Сляза засланіла.
«Даруй ты мне! Мучылася
Век я ў чужой хаце!..
Даруй-жа мне, мой сыночак!
Я... я твая маці!»
І замоўкла.
Самлеў Марка, —
Зямля задрыжала.
Прахапіўся — да мацеры,
А маці ўжо спала.

Глыбокая мацярынская любоў здольна прымусіць перанесці ўсё, гэта любоў самая моцная, самая шчырая.

V.

Мара аб свабодзе, аб волі, аб вольным чалавеку, заклік да барацьбы супроць прыгнятальнікаў, гарачая абарона прыгнечаных перапляталася ў Шэўчэнка з любоўю да радзімы, да Украіны.


Ворагі народа скажалі вобраз Шэўчэнка, выдаючы Шэўчэнка за вузкага нацыяналіста. Гэта—несусветная бязглуздзіца. У Шэўчэнка былі асобныя нацыяналістычныя зрывы, але ён усё жыццё заставаўся рэвалюцыйным дэмакратам і разумеў, што інтарэсы ўсіх прыгнечаных супадаюць. Ён ваяваў не супроць рускіх мужыкоў, не супроць рускіх рэвалюцыянераў, а ваяваў з царамі, памешчыкамі, з самадзяржаўна-бюракратычным ладам, які прыгнятаў не толькі яго, але і ўсіх рускіх дэмакратаў-рэвалюцыянераў. Пачуцці Шэўчэнка былі зразумелы ўсім перадавым змагарам за свабоду. Трэба сказаць, што ў Шэўчэнка да яго пратэсту прымешваліся пачуцці болю за родную Украіну. Самы пратэст праніқаўся гэтым пачуццём болю і любві да Украіны і атрымліваў нацыянальную народную афарбоўку. Выкарыстоўваючы вядомую формулу таварыша Сталіна, можна сказаць, што ў творчасці Шэўчэнка рэвалюцыйна-дэмакратычны змест пададзен у нацыянальнай форме.

Для Шэўчэнка перш за ўсё характэрна шчырая, беззаветная любоў да радзімы, тое пачуццё, якое так высока цэнім мы цяпер. Яго герой Гонта з паэмы «Гайдамакі» прыносіць у афяру радзіме ўласных дзяцей, якіх маці зрабіла каталікамі. Карціна забойства Гонтаю сваіх дзяцей нарысавана з выключным майстэрствам і нагадвае нам расправу гогалеўскага Тараса Бульбы са сваім сынам Андрэем.

«А сягоння, сыны мае,
Горачка мне з вамі.
Пацалуйце мяне, дзеці, —
Не я забіваю,
А прысяга!».
Махнуў нажам —
І дзяцей не мае.
Парэзаныя палеглі.
«Тата»! — булькаталі:
«Тата, тата. Мы не ляхі!
Мы...» ды й замаўчалі.

Любоў да радзімы паглынае ўсё, ад любві да радзімы і нянавісці да яе ворагаў Гонта забівае сваіх дзяцей, якія могуць стаць ворагамі Украіны і народа. Так расправіўся з сваім Андрэем Тарас Бульба. І нават хаваць дзяцей не стаў Гонта, звярнуўшы ўсю горыч і гнеў супроць прыгнятальнікаў-ляхаў:

«Кары, ляхам, кары!»
І каралі. Страшна, страшна
Умань запалала.



(Аўтограф верша Т. Г. Шэўчэнка «Заповіт».

Гэта страсная любоў да Украіны, жаданне ёй шчасця выклікаліся ў Шэўчэнкі не толькі асабістымі меркаваннямі, але галоўным чынам матывамі сацыяльнымі. Родны край быў у няволі, землякі — адны заняволеныя, другія разбэшчваліся царскім самадзяржаўем і здраджвалі народу, становячыся ў рады катаў і мучыцеляў. Пачуцці гора, пакуты і смутку за радзіму і перадае Шэўчэнка ў сваіх вершах.

Любоў да Украіны перарастала ў Шэўчэнка ў любоў да ўсіх працоўных, да людзей-братоў, якіх прыгняталі багі, цары і памешчыкі. Толькі ў Шэўчэнка яна ўскладнялася пачуццём смутку і болю за двайное прыгнечанне свайго народа, адсюль страсны заклік да барацьбы за свабоду, які зліваецца з заклікам да барацьбы за вызваленне ад нацыянальнага гнёту.

Як-бы парадаваўся Т. Г. Шэўчэнка, гледзячы на сваю Украіну цяпер, калі украінскі народ свабодна жыве і будуе сваё жыццё, сваю культуру, мастацтва, развівае сваю мову, калі разбурана турма народаў і на яе месцы створан свабодны братні саюз народаў;

ТВОРЧЫ ВЕЧАР МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

24 студзеня ў Доме пісьменніка адбыўся творчы вечар маладых пісьменнікаў тт. Турэцкага, Зубца, Цімашкова і Гаўрылава.

У абмеркаванні творчасці маладых аўтароў актыўны ўдзел прынялі пісьменнікі, паэты і крытыкі — тт. Бядуля, Броўка, Клімковіч, Куляшоў, Крапіва, Мурашка, Шарапаў, Агняцвет, Бярозкін, Цітоў.

Прыемнае ўражанне пакінулі ў прысутных вершы маладога паэта Л. Гаўрылава. Вершы яго напісаны шчыра, на злабадзённыя тэмы. Малады паэт з густам адлюстроўвае беларускі пейзаж. Але тав. Гаўрылаў яшчэ недастаткова авалодаў тэхнікай верша, у яго творах сустракаюцца рытмічныя зрывы, заштампаваныя радкі, перапевы, адчуваецца расцягнутасць.

Свежасцю вобразаў і войстрым гумарам вылучаецца творчасць маладога празаіка Б. Зубца. У маладога пісьменніка войстрая назіральнасць, добрае веданне быту. У апавяданні «Макашинские любители» надзвычай праўдзіва, з тонкім дабрадушным гумарам адлюстравана дзейнасць вясковага тэатра. Малады пісьменнік імкнецца паказаць сваіх герояў праз цікавыя дыялогі, праз канкрэтныя і трапныя дэталі. Каб паказаць, напрыклад, віслковага настаўніка, ён затраціў усяго адзін абзац: настаўнік заўсёды элегантны і перад тым, як сесці, падсцілае на крэсла белую хустачку.

Аднак і ў тав. Зубца, як і ў большасці пачынаючых пісьменнікаў, ёсць свае недахопы. У апавяданнях шмат шарахаватасцей, стылістычных пагрэшнасцей. У асобных апавяданнях адчуваецца ўплыў Чэхава, Гогаля, Зошчанкі. Так, апавяданне «В ресторане» навеяна чэхаўскім «Хамелеонам».

Бясспрэчнае дараванне выяўляе малады паэт А. Турэцкі. У яго вершах ёсць свежыя, смелыя вобразы. Асноўны недахоп тав. Турэцкага — няведанне быту, навакольнага жыцця. І гэта натуральна: яму ўсяго 14 год. Яму нехапае жыццёвых назіранняў, вопыту. Вось чаму ў яго вершах шмат кніжнасці, надуманасці, вось чаму яму не ўдаецца яшчэ глыбока распрацаваць сур'ёзную тэму.

На вечары разгарэліся гарачыя спрэчкі па пытанню — на якія тэмы, галоўным чынам, пісаць Турэцкаму? Некаторыя гаварылі, што Турэцкі павінен пісаць вершы аб піонерскіх лагерах, аб жучках, рыбках, вавёрках і дзіцячых забавах. Другія-ж, наадварот, даводзілі, што Турэцкаму па-плячу тэмы сусветных маштабаў і што няма чаго абмяжоўваць яго, стрымліваць яго паэтычныя парывы.

Мы можам сказаць адно: Турэцкаму патрэбна вучыцца, вучыцца паэтычнаму майстэрству ў класікаў рускай паэзіі, у вялікага паэта совецкай эпохі Маякоўскага, вучыцца назіраць жыццё, тады ён сваё месца ў паэзіі знойдзе сам.

Малады паэт І. Цімашкоў умее выбіраць канкрэтную тэму для верша. Але ў вершах тав. Цімашкова адчуваецца вялікі ўплыў іншых паэтаў — Твардоўскага, Кальцова. Больш таго, у яго вершах ёсць налёт стылізацыі, псеўданароднасці. Тав. Цімашкоў не ўмее знайсці канкрэтную паэтычную дэталь, не ведае жыцця, быту, а ў выніку ў яго трапляюцца фальшывыя, надуманыя вобразы, ненатуральнасць (верш «Дзед»). Некаторыя вершы, як «Бабка Наста», зусім празаічныя, без паэтычнага пачуцця.

Удзел у творчым вечары вопытных пісьменнікаў і паэтаў дапамог маладым пісьменнікам зразумець, што над мастацкім творам патрэбна працаваць сур'ёзна, улумліва, з пачуццём. Такія вечары трэба практыкаваць часцей

А. БЯЛЕВІЧ.

Слово-полководец человечьей силы

Александр ШАРАПОВ

ДЕТСТВО

(Вступление в поэму «Родимая земля»).

Я с малых лет и в дождь, и в зной
С отцом слепым вдвоем
Дорогами земли родной
Ходил поводырем.
Бродили с ним из стана в стан
По селам, деревням;
Кусок, что христа-ради дан,
Делили пополам.
Брели и думали о том,
Что наш удел —
Иди...
Наш хлеб,
Наш кров,
Наш стол и дом
Всегда был впереди.
Но я был рад на целый свет
И дня не горевал.
Я с малых, самых малых лет
Счастливей, дней не знал.
Мы полем шли,
И поле сплошь
Несло отраду нам,
Волною набегая, рожь
Склонялася к ногам.
Широкими лугами шли
Без тропок, без дорог,
В лугах на отдых нам цвели
Ромашка и чеснок.
Мы реки в топких берегах
Переходили вброд,
О грозах, бурях и ветрах
Мы знали наперед.
И мне казалось —
День за днем
Просторами земли
Мы со слепым отцом вдвоем
Хозяевами шли.
Счастливей, радостнее дней
Я с малых лет не знал,
Но только радости моей
Отец не разделял.
Кричал отцу я:
— Погляди!
(Не помня, что он слеп)
Какое поле впереди,
Какой высокий хлеб
Стеной колосьев налитых
Лег из конца в конец!
— Не наш тот хлеб, что видишь ты,—
Мне отвечал отец.
В июльский, августовский день,
В неумолимый зной
Мы шли с отцом в лесную тень
Полуденной порой.
В воде криничной, ключевой
Мочили сухари,
Как петухи, над головой
Сидели глухари.
— Вот здесь построить новый дом,
Землянку пусть,
Шалаш...
Но он твердил мне об одном:
— Не наш тот лес, не наш.
Мы шли по берегу реки,
Куда вела вода.
С челнов смоленых рыбаки
Бросали невода.
Вода журчала под веслом,
Шли лодки на причал.
И мой отец, рыбак в былом,
«Бог на помощь» кричал.
И затуманился на миг
У тихих берегов,
И головой седой поник.
— Не их, не их улов.
В тот день застала нас гроза
Средь ночи на пути.
Кругом — хоть выколи глаза,
А надобно итти,
Итти сквозь ночь, куда — нивесть,
Искать себе приют,
Туда, где теплый угол есть,
Туда, где нас не ждут.
Шли без пути, ложились ниц
Под проливным дождем,
Пока в сиянии зарниц
Я не увидел дом.
Манил он отдыхом вдали,
С оградой белый дом.
Но лишь к воротам подошли,
Сказал отец:
— Идем!
Под этой кровлею ночлег
Не уготован нам.
В усадьбе здесь из века в век
Живет помещик, сам.
В тот день,
В ту ночь
У скирдов ржи
Скорбел и плакал я —
Чужая вся кругом лежит
Родимая земля.

**

Тринадцать лет минуло мне
И тем же шли путем.
Но вот, однажды по весне
Сказал отец:
— Идем!
Не мало пройдено дорог,
Не мало лет и зим
В дорогах прожито, сынок,
Веди к местам родным!
Где жили дед и прадед мой,
Где молодость моя
Весной обласкана одной,
Где колыбель твоя.
И брел, минувшее будя,
Надежды и мечты...
Упал он в поле, не дойдя
До дому полверсты.
На перекрестке двух дорог
Упал в зеленый ров...
Расслышать я тогда не мог
Его последних слов.

**

Могильный холм. Сосновый крест,
С другими в тесный ряд..
С тоскою я смотрел окрест,
Бросал прощальный взгляд
На ветхий домик свой, на лес,
На запустевший сад, —
На все, что звал и в дождь и в зной
Родимою землей.

М. КОРОТКЕВИЧ

МАТЬ

Вышивала узоры иглой
на широком льняном полотне,
Вспоминала о муже своем,
что погиб на гражданской войне.
Слезы крупные взор застилают, —
темно,
Под рукой на колене дрожит полотно,
И тускнеет на нем шелковистый узор
Под уроненной жаркой слезой.
Где же тот позабытый, далекий
пустырь,
На котором уснул богатырь?
Или в чаще лесной, стременами звеня,
Он от пули свалился с коня?
Или острою шашкой в степи на-скаку
Полоснули его по виску?
Может, взрывом снаряда зарыт на-
всегда?
Только славу о нем не стирают года.
Кровь погибших отцов проливалась
не зря, —
Кумачом над землей загорелась заря.
На большом полотне богатырской
страны
Новой жизни узор вышивают сыны.

И. ТИМОШКОВ

Утро

Утро. Солнце, поднимаясь
За рекой,
Разлило лучи над полем
Широко.
Сизокрылый над лугами
Тает дым.
Плодородьем наливаются
Сады.
И зеленые в лазоревой
Дали
Волны жита молодого
Поплыли.
От деревни, потонувшей
В тополях,
Дым белесый потянулся
На полях.
Сквозь встревоженные заросли
Ракит
С песней звонкой проплывают
Рыбаки.
Весла плещут. Лодки мчатся,
А река,
Словно небо голубое,
Глубока.
Солнце лебедем купается
В воде...
Это вышел в путь-дорогу
Новый день.

П. Слесарев

Два друга

Вместе ели, вместе пили,
Пополам — походы, труд.
Вместе в праздники ходили
К двум студенткам в институт.

Для двух девушек, двух Зин,
Шли в цветочный магазин.
Два букета, два похожих
Покупали подороже.
И по улице Марата,
Мимо лавок и ларьков,
Шли танкисты, как два брата,
Не жалея каблуков.

И как будто по заказу
Давний помня уговор,
Два дружка влюбились сразу
В двух двоюродных сестер...

Замолчал за речкой зяблик,
День осенний залил дождь.
С песней от полей и фабрик
К нам спешила молодежь.
Мы смеялися от счастья.
Жали руки молодым,
Говорили адрес части,
Что писать в письме родным.

Вечер... Строит помкомвзвод
Год второй и первый год.
Видит — грязный пулемет.
« — Кленов, два шага вперед!..
Подвели вы всех подряд,
Получайте же наряд!».
Молодежь дышала глухо,
В форточку врывалась сырь.

В паутине билась муха,
Торопились жить часы.
Солнце скрылось за границей.
Кленов шел сердит и строг.
С плачем гнулись половицы
Под ударом его ног.

Ночь стоял у бензосклада
Возле пасмурной реки.
Снег холодным пухом падал.
Стыли ноги, кулаки.
К полдню солнце... Стало жарко,
Зазвенел ручьями снег.
Кленов шел один с развода,
Повстречался с помкомвзводом.
Подал другу «Нашу марку»,
Друг тотчас раскрыл «Казбек».

Поднимался дым отвесно,
Мимолетный, голубой.
Как мирились — неизвестно,
Только в первый выходной
Вдоль по улице Марата,
Мимо лавок и ларьков,
Два танкиста, как два брата,
Не жалея каблуков,

Шли, бесспорно, все поймут,
К двум студенткам в институт!

Авива Левина

Дружба

Мы живем с тобою в городе одном.
До чего знаком мне твой высокий дом...

Светлое окошко, лестницы пролет,
комната, в которой ночи напролет
проводили часто в мире теплых слов,
в дружеской беседе, с книгою стихов.
Говорили люди, поглядев на нас:
— Крепнуть этой дружбе с часу да на
час,
вот такую дружбу не разлить водой,
и друзьям не страшно встретиться с
бедой.

Да не оправдался этот разговор.
Что-то изменился ты с недавних пор,
что-то опустил ты серые глаза —
о любви подруге невзначай сказал.
Пожалевши дружбы пять счастливых
лет,
не нашла я сразу правильный ответ.
По реке уснувшей плавала луна;
в этот вечер ясный другу солгала:
я не об'ясняла что, да почему,
я не обещала верной быть ему,
я не обещала другу быть женой —
я лишь промолчала в этот час немой.
Если не сумела я любовь найти,
разве дружбе нашей больше нет пути?
Почему, обиду в сердце затаив,
ты проходишь мимо, голову склонив?
Неужели дружбы чуткие слова
нынче потеряли все свои права?
Неужели дружбы ясный, честный взгляд
вдруг померк, как меркнет осенью наш
сад?

Мы живем с тобою в городе одном,
каждый день я вижу твой высокий дом.
Как пройду я мимо, невзначай взгляну,
дружбу нашу добрым словом помяну.

А. КУПЕРШТОК

ДВА СТИХОТВОРЕНИЯ

I.

Осень

В трамвае было холодно и сыро.
Кондуктор задремал в своем углу.
Ему приснилась теплая квартира,
Сынишка с медвежонком на полу.
Вагон гремел и глухо дверь
скрипела,
Дрожало непроглядное стекло...
Гражданка грустно на окно глядела,
У гражданина с зонтика текло.
У старика, закутанного в шубу,
Сквозь кожу пробивалась синева.
От тряски очень больно ныли зубы,
А их всего осталось только два...
Трамвай гремел.
Он с виду был неистов.
Но на одно мгновенье вдруг затих,
Тогда охапка веток золотистых,
Вошла в вагон, как нынче входит
в стих.
Охапка пахла солнцем и лимоном.
И все очнулись на своих местах.
Гражданка улыбнулась, как ребенок,
Старик забыл о ноющих зубах.
В вагоне стало весело и чисто.
Светил из-за охапки женский
взгляд...
О, солнечно-лимонный листопад!
О, женский взгляд осенне-
золотистый!

II.



28 студзеня, для ўдзелу ў вечарах беларускай літаратуры з 29-га студзеня па 1 лютага, у Маскву выехала група пісьменнікаў і работнікаў мастацтва БССР.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі вечароў на Мінскім вакзале перад ад'ездам. Злева направа: народныя паэты БССР—ЯНКА КУПАЛА і ЯКУБ КОЛАС, кампазітар І. ЛЮБАН, пісьменнік К. КРАПІВА і кампазітар Н. ШЧЭГЛОЎ.

В. КУДИМОВ

БЕГСТВО

(ОТРЫВОК)

За Смоленском все три дня тянулся белорусский пейзаж. Бурые кочковатые луга, болотистые низины с прошлогодней осокой, на косогорах березовые рощицы и облачное низкое небо.

Откинувшись в угол коляски и запахнув дорожную шинель, Глинка, казалось, спрятался: маленький, плотный, с чуть обрюзгшим, пожелтевшим лицом и седеющими волосами.

На обочине коляску сильно качнуло. Будто разбуженный от каких-то дум своих этим движением, запел ямщик. Глинка прислушался, но думы, воспоминания о прошлом опять захватили его.

...Да, не получилась жизнь... Снова бегство... А может случиться, вот так и умрешь в дороге. Но почему он равнодушен ко всему, что оставил? Только музыка, песня... О нет, осталась еще любовь к родине. Не к дворянскому Питеру, не к постылой чиновничьей России, а вот к этому небу, лесам и равнинам, к грустной дали, при виде которых так сладко сжимается сердце и плакать хочется, точно от песен, что слагает нищий народ.

А были счастливые дни. Особенно памятно одно июньское утро в Новоспасском. Еще с вечера тревожила эта сцена. Солнечный луч играл на полированной крышке рояля. Закрыв глаза, он с минуту сидел, не прикасаясь к нему и прислушиваясь. Потом медленно и вначале неуверенно стали возникать звуки, рисующие сцену в лесу.

По колени увязая в снегу, в чащобу и глушь, где не было видно даже звериных следов, идет, сутулясь, старик. На самые брови надвинута овчинная шапка, и туго подпоясан рваный полушубок. Лица в темноте не видать, а только белеет заиндевевший клок седой бороды. За ним, проклиная тяжелый путь, звеня оружием, гуськом идут ляхи. Чем дальше, тем глуше и непроходимее лес. Крепостной старик Иван, выбиваясь из сил, уже еле бредет. Но вот и сил нехватает, конец. Нарастает грозный речитатив голосов.

Пальцы мелькают по клавиатуре. Вот оно, вот что вчера тревожило.

Хитрость разгадана, но уже поздно. Озверевшие ляхи бросились на Сусанина. Зазвенели клинки, высекая зловещие искры, и белый снег почернел...

Нервная дрожь пробегала в пальцах, передаваясь клавиатуре рояля. Звуками рисовал он смерть — героическую смерть за родину, когда умирают счастливыми. Обессиленный внутренним напряжением, он порывисто закрывал крышку и, задержавшись у буфета, шел, не разбирая дорожек, через парк в поле.

Солнце поднималось уже на полдень. Коровы, лениво помахивая хвостами, жадно, но аккуратно, под самый корень срывали скудную травку. Выпас у новоспасских мужиков, признаться, был неважный. Матушка — барыня Евгения Андреевна, видимо, прижимала мужичков с выпасом; свинух да кочки. На самой высокой и зеленой сидит согнувшись, без шапки, кривой старик и плетет лапоть.

— Яша, здравствуй!

— Здоровеньки будьте, батюшка-барин, милостивец наш ласковый, свет Михайло Иванович, на многие лета будьте здоровы.—Голова мотается в поклонах, а зрячий глаз хитро косится в направлении барской руки. Из кармана Глинка извлекает полштоф и два черствых пирожка, завернутых в синюю сахарную бумагу.

— О, ххосподи!.. Спасибочко, батюшка-барин, спасибо Михайло Иванович. Ужотко я, чорт кривой потешу сегодня тебя, сыграю твоей милости. А вечор, эх, и удумал я нову песенку...

— Ты, Яша, выпей, не стесняйся.

— А и то истина, выпью, свет Иванович, за твое здоровьице промочу горло. Ласков ты до простого люда, не брезглив до мужицкой компании. Господи Иисусе Христе — Тыльной стороной почерневшей узловатой руки Яков поводил по седым и редким, будто у кота, усам и, запрокинув голову, медленно высасывал водку.

Вскоре его охватило философское настроение. Жуя беззубым ртом пирожок, Яков не спеша говорил:

— Жизня-то, жизня, милой барин: солнышко, травка, птушечки... А люди поганят землю. Слезы льют, а поганят. Слышь-ка, дядюшка твой Григорий Андреевич опять отдул музыкантов альта Саньку и втору Кирюшку. Вечор ихний пастух Онисим сказывал... Лютует на старости лет его милость. А пошто? Все умрем...

— Да ну их, Яков, играй-ко!

— И то правда, баринушко. — Старик взял в руки жалейку и лицо у него стало строгим. Полный задумчивой грусти девичий тонкий голос пролетел, как дуновение ветра. О, если-б знал пастух хоть сотую долю того, что знал его барин.

Вытащив из кармана припасенный листок бумаги и расправив на колене, барин писал непонятные для Яшки кружки и палочки. А жалейка плакала. О чем? Не о крепостной ли загубленной Яшкиной доле? Не о голубом ли белорусском небе и белоствольных березах? Или о зеленых тучных лугах, на которые никогда не попасть мужицким коровам? Как знать. Мудр и сложен язык музыки для непосвященных в тайны звуков.

Барин задумчиво чертил на бумажке и лицо его, как и лицо пастуха, становилось строгим, непроницаемым. Его покоряли звуки и Яшкино искусство, но мыслей пастуха он не мог постигнуть. Всю жизнь он сторонился политики и жил для искусства, ибо, по его понятиям, искусство было подвигом его жизни.

После блистательного успеха «Сусанина», обласканный, награжденный царем, он вошел в «большой свет». Он хотел занять тут, как ему казалось, по праву собственное место. Но художник и царедворец не могли в нем ужиться. Разрыв с женою, болезни, неудавшаяся служба в придворной капелле, богемная компания и безалаберность русской действительности оставили только сердечную горечь. Написана опера «Руслан и Людмила» и... не понята. Высший свет оценил талант обидными словами: «кучерская музыка».

И появились тогда полные тревоги и горечи мысли. Он хранил их пока про себя, но уже чувствовал — счастья в России ему не найти. Убийственное равнодушие к искусству и ко всему прекрасному, атмосфера казарменной России навалились, окутали удушьем, и тогда — задыхающийся, больной — он с трудом вырвался за границу.

Потянулись годы скитаний: Милан и Гренада, Берлин, Париж и Варшава, концертные залы европейских столиц с первоклассными мастерами и гитарист в захолустной таверне, доводящий игрою до слез. Смерть матери и еще больший душевный надрыв. Наезды в Россию, чтобы снова бежать, как и в этот раз. Куда, зачем? От самого себя, от действительности?..

Глинка очнулся и открыл глаза. Ямщик все тянул бесконечную песню. «Эк его разобрало» — усмехнулся Глинка и вздохнул. Да, не получилась жизнь... Опять бегство...

Собственно, решение бежать созрело еще в начале прошлого года и усилилось после истории с романсами. Оказалось, что некоторые из этих ро- [illegible] для дуэта, но подписанные его именем.

И вот стало наслаиваться одно на другое. За границей появилась бестактная статья Рубинштейна, начались (о, в который уже раз!) интриги среди старых знакомых. Василько-Петров, либреттист, распускал нелепые толки и сплетни в обществе, брошена начатая опера и уничтожено написанное. Усилилась болезнь.

Но пришло долгожданное разрешение на заграничный паспорт. Мигом осмотрена, приготовлена в путь коляска и сложены вещи. Петербургский день с утра не сулил ничего хорошего. Огромные, причудливые, как звери Апокалипсиса, плыли облака. Весна пришла поздно и в воздухе чувствовались неустойчивость и холод, свойственные столице.

Пошла окраина, убогие домишки, жалкие и обшарпанные, похожие на нищих у паперти. На выбоинах мостовой коляску подбросило. Сестра напоминала о каких-то теплых носках, и Глинке вдруг так стало не по себе, что он, как о счастьи, подумал о прощании. У шлагбаума коляска остановилась. Сходя и торопясь, он зацепился о подножку. С неба стал падать не то дождь, не то ледяная крупа. Несколько капель покатилось за воротник. Сыро, неуютно. Стасов о чем-то горячо говорил. Глинка взял его за руку.

— Ладно уж, Владимир Васильевич, прощевай... Свидимся ли?..

Они обнялись. Подошла сестра и всхлипывая стала его крестить.

— Хорошо, Люда, хорошо, не плачь...

Он поставил уже ногу на подножку коляски. Поддерживая его под локоть, камердинер хотел помочь. Глинка обернулся. Не все еще, что-то надо сказать, — что-то ласковое, веселое — этим близким людям. Он отстранил Якова и выпрямился. Ничего, ничего [illegible] мысль, неотвязная и чуть тревожащая с самого момента, когда запел ямщик, незаметно созрела. Да, да — «Попутная песня». Еще давно написанная на слова Кукольника, она не понравилась Глинке. Чего-то недоставало в ней, было не то... «Истинно, истинно — народ придумывает музыку, а мы ее оранжируем»,— прошептал он и стал шарить по карманам.

Если бы оглянулись ямщик и камердинер, возможно, удивление и отразилось бы на лицах у них. Но первый все продолжал петь, а Яков думал о своем.

Глинка же сидел, согнувшись в неудобной позе, положив на колени дорожный несессер. На обрывке оберточной бумаги карандашом он чертил неровные пять нотных линий и ставил на них лишь ему понятные знаки. «Музыка — душа моя», — шептал он, будто оправдываясь перед кем-то неизвестным, и невольные, непрошенные слезы катились из усталых глаз.

Нет, тайная дума быстрее летит,
И сердце, мгновенья считая, стучит;
Коварные думы мелькают дорогой,
И шепчешь невольно: как долго, как
долго.

Вот-вот, в этих словах вся грусть, вся жалоба сердца о том прекрасном, что где-то добровольно оставила оно. Но добровольно ли, и где оно, это прекрасное? В России или на чужбине? Ах, не все ли равно. Вот ямщик не перестал бы петь. Ведь как просто и отлично рождается у него мелодия... И за сердце берет, и хочется поплакать... Ну, что же, если грусть светла, не грех и поплакать, — станет легче. А ямщик, не видя, что делает барин, совсем тихо закончил свою длинную, как эта дорога, песню.

Дорога, дорожка — путь,
Ну, куда ты бежишь, куда выведешь.
И-эх, кручина-змея подколодная...

Закончил, причмокнул на лошадей и тряхнул вожжами.

Да XXI-й гадавіны Чырвонай Арміі

РАБОТНІКІ МАСТАЦТВА—СВАІМ ПАДШЭФНЫМ

Работнікі мастацтваў БССР актыўна рыхтуюцца да XXI-й гадавіны Чырвонай Арміі. Як і напярэдадні ўсіх гадавін Чырвонай Арміі, шэфская камісія пры рэспубліканскім камітэце прфсаюза работнікаў мастацтваў разам з кіраўніцтвам тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў распрацавала план мерапрыемстваў па культурнаму шэфству над РСЧА і войскамі НКВД.

Пачынаючы з 10 лютага тэатры і музычныя ўстановы арганізуюць выезды цэлых калектываў альбо брыгад у часці БАВА і НКВД, дзе пакажуць свае лепшыя работы (спектаклі, канцэрты, творчыя справаздачы). 18 і 23 лютага ўсе тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы арганізуюць на сваіх стацыянарах ранішнія спектаклі для гарнізонаў. Тэатр юнага гледача і Лялечны тэатр рыхтуюць ранішнія спектаклі для дзяцей начскладу гарнізонаў.

Тэатры Менска, Філармонія, Кансерваторыя і Радыёкамітэт арганізуюць для Менскага гарнізона ў дні святкавання XXI-й гадавіны Чырвонай Арміі 17 вялікіх канцэртаў, у тым ліку Тэатр оперы і балета—5 канцэртаў, Філармонія—4, Кансерваторыя — 3 і г. д.

Апрача таго, сімфанічныя аркестры Філармоніі, Тэатра оперы і балета, Кансерваторыі, гомельскага, магілёўскага і віцебскага музычных вучылішчаў наладжваюць справаздачныя канцэрты на стацыянарах альбо ў Дамах Чырвонай Арміі. У праграме гэтых канцэртаў—творы класікаў і савецкіх кампазітараў.

Вялікія канцэрты найбольш таленавітых студэнтаў і вучняў наладжваюць Кансерваторыя, музычныя вучылішчы і школы 26 лютага.

Актыўны ўдзел у мерапрыемствах па культурнаму шэфству над Чырвонай Арміяй прымуць таксама кампазітары, мастакі, Радыёкамітэт. Саюз савецкіх кампазітараў рыхтуе творчыя справаздачы кампазітараў у часцях Чырвонай Арміі і НКВД, выпускае зборнік песень, прысвечаных XXI-й гадавіне Чырвонай Арміі і прыняццю ваеннай прысягі.

Саюз савецкіх мастакоў дапаможа мастацка аформіць клубы, ленінскія пакоі і куткі, выстаўкі, тэксты ваеннай прысягі, акажа практычную дапамогу мастакам-самавучкам — чырвонаармейцам, камандзірам і членам іх сямей.

Радыёкамітэт арганізуе рад выступленняў перад мікрафонам лепшых людзей часцей Чырвонай Арміі і войск НКВД, рыхтуе канцэрты чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, сустрэчы знатных людзей Чырвонай Арміі са стаханаўцамі прадпрыемстваў і работнікамі мастацтваў на кватэрах камандзіраў, у інтэрнатах байцоў і г. д.

Тэатры і музычныя ўстановы камандзіруюць сваіх вядучых работнікаў у калектывы чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці для практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да гадавіны. Арганізуецца чатырохдзённы семінар для кіраўнікоў гурткоў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Вялікая работа, прысвечаная XXI-й гадавіне Чырвонай Арміі, праводзіцца і ўнутры калектываў тэатраў і іншых прадпрыемстваў мастацтваў. Арганізуюцца стралковыя спаборніцтвы сярод работнікаў мастацтваў як унутры прадпрыемства, так і паміж прадпрыемствамі і падшэфнымі ваеннымі часцямі. Рыхтуецца здача норм на званне варашылаўскіх стралкоў першай і другой ступені, падшэфныя часці дапамагаюць сваім шэфам узмацніць работу абаронных гурткоў, будуць прачытаны лекцыі і даклады на ваенныя тэмы. Паміж 15 і 20 лютага на ўсіх прадпрыемствах мастацтваў будуць праведзены агульныя сходы з дакладамі аб XXI-й гадавіне Чырвонай Арміі.

1-га сакавіка ў Доме Чырвонай Арміі імя маршала Савецкага Саюза тав. К. Е. Варашылава на сумесным пасяджэнні прадстаўнікоў РСЧА, войск НКВД і работнікаў мастацтваў будуць падведзены вынікі ўсіх гэтых мерапрыемстваў. На гэтым вечары лепшыя калектывы чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці прадэманструюць свае дасягненні.

Вось коратка план мерапрыемстваў па культурнаму шэфству над часцямі БАВА ў сувязі з яе XXI-й гадавінай. Гэта—план-мінімум. У часе абмеркавання яго на агульных сходах работнікі мастацтваў высоўваюць сустрэчныя планы. Напрыклад, агульны сход калектыва Дзяржаўнай філармоніі БССР замест 10 канцэртаў, паводле плана, вырашыў даць для часцей Чырвонай Арміі 25 канцэртаў.

Такія-ж сустрэчныя абавязацельствы бяруць на сябе і іншыя калектывы.

Работнікі мастацтваў БССР, звязаныя з байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі і войск НКВД на працягу звыш 15 год мацнейшымі узамі дружбы і сумеснай велізарнай культурнай работай, з гонарам апраўдаюць высокае званне шэфаў Чырвонай Арміі.

П.

Работнікі мастацтва—шэфы самадзейнасці

УЗМАЦНІЦЬ СУВЯЗЬ З КАЛЕКТЫВАМІ САМАДЗЕЙНАСЦІ

25 студзеня ў клубе імя Сталіна (Менск) адбылася гарадская канферэнцыя, прысвечаная выніхам алімпіяд мастацкай самадзейнасці канца мінулага года. На канферэнцыі прысутнічалі нар. арт. рэсп. Уладамірскі, засл. артысты рэсп. тт. Ржэцкая, Платонаў, Нікалаева, Сокал, Трэпель, Арончык і інш., а таксама прадстаўнікі і ўдзельнікі калектываў самадзейнасці гор. Менска. Натуральна, што большасць выступаўшых спынялася галоўным чынам, на пытаннях умацавання сувязі майстроў мастацтваў з калектывамі самадзейнасці.

— Наш свяшчэнны абавязак — дапамагаць мастацкай самадзейнасці расці і мацнець, бо адгуль мы чэрпаем нашы прафесіянальныя кадры,— заявіў у сваёй прамове тав. Уладамірскі. — Заклік народных артыстаў СССР тт. Масквіна і Барсавай аб шэфстве майстроў мастацтва над калектывамі мастацкай самадзейнасці павінен атрымаць самы шырокі водгук. Многія работнікі тэатраў, кампазітары ўжо ўключаюцца ў практычную дапамогу самадзейнасці. Перад работнікамі мастацтваў і мастацкай самадзейнасці стаіць вялікая, адказная і ганаровая задача — у канцы гэтага года паказаць на дэкадзе ў Маскве дасягненні прафесіянальнага мастацтва і мастацкай самадзейнасці БССР. Работнікі мастацтваў абавязаны дапамагчы самадзейнасці дабіцца яшчэ большых поспехаў. Мы павінны апраўдаць ускладзеныя на нас вялікія надзеі.

Кампазітар Палонскі адзначае, што сувязь паміж кампазітарамі і мастацкай самадзейнасцю яшчэ слабая. Тав. Палонскі прыняў шэфства над калектывамі самадзейнасці Асінторфа і ўзяў на сябе абавязацельства выязджаць туды раз у месяц для кансультацыі і практычнай дапамогі. Тав. Палонскі выказаў упэўненасць, што наша мастацкая самадзейнасць у саюзе з майстрамі мастацтваў пойдзе наперад.

— І мы будзем шчаслівы, — заявіў ён, — калі на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве таварыш Сталін скажа «добра».

Рад практычных парад самадзейным калектывам даў у сваёй прамове засл. арт. рэсп. тав. Сокал.

Кіраўнік хора клуба металістаў тав. Б. Я. Разоўская адзначыла, што яна да апошняга часу не адчувае дапамогі майстроў мастацтва. Удзельнікі самадзейнасці імкнуцца атрымаць новыя творы, але часта іх жаданне сустракаецца з бюракратычнай роўнадушнасцю чыноўнікаў ад мастацтва. Некаторыя арганізацыі (Радыёкамітэт і інш.) адмаўляюць самадзейным калектывам у новым рэпертуары, пакуль... яны самі не выступяць з ім.

Удзельнікі самадзейнасці тт. Коўнер (джаз фабрыкі «Кастрычнік»), Мялавецкі (клуб металістаў), дырэктар клуба імя Сталіна тав. Гальштэйн, мастацкі кіраўнік ансамбля песні і пляскі клуба будаўнікоў тав. Самсонаў і інш. гаварылі аб велізарным імкненні калектываў самадзейнасці да авалодання вышынямі прафесіянальнага мастацтва і выказалі шчырую падзяку майстрам мастацтва за гатоўнасць дапамагчы самадзейнасці.

Прадстаўнікі клубаў імя Сталіна, металістаў, работнікаў дзяржгандлю выклікалі адзін другога на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Вечар закончыўся ўручэннем ганаровых грамат і жэтонаў лепшым калектывам самадзейнасці і асобным выканаўцам, а таксама вялікім канцэртам майстроў мастацтваў.

В. Д.

ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА

Кампазітар Сакалоўскі, які ўзяў шэфства над харавым калектывам фабрыкі імя 8 сакавіка, быў прыемна здзіўлен, калі, адчыніўшы дзверы сталовай, дзе адбывалася спеўка хора, пачуў напісаную ім самім песню «Ой, сокал, мой сокал».

Яшчэ больш узрадаваліся ўдзельнікі хора, даведаўшыся аб прыходзе кампазітара і яго намеры — прыняць над імі шэфства.

Склад хора — 30 дзяўчат, з якіх самай старэйшай 26 год, а малодшай 16. Першае, што кідаецца ў вочы — гэта вельмі сур'ёзныя, удумлівыя адносіны ўсяго харавога калектыва да рэпетыцый, да авалодання харавым мастацтвам. Маладыя, звонкія галасы гучаць шчыра, свабодна. Кіраўнік хора тав. Васільеў — музычна пісьменны чалавек — дабіўся за кароткі час добрых вынікаў.

Усё-ж хор мае патрэбу ў кваліфіцыраванай дапамозе. Трэба пашырыць рэпертуар хора, уключыць народныя песні, уняць якасць выканання.

Гэту дапамогу тав. Сакалоўскі пачаў аказваць у першы-ж вечар. Ён даў некалькі практычных парад — як трэба выконваць песні «Ой, сокал, мой сокал», «Праважанне», «Як крыніца цячэ» і інш. Параіў уключыць у рэпертуар песню «Чаравічкі» Т. Г. Шаўчэнка, абяцаў прадаставіць магчымасць хору паслухаць ансамбль песні і пляскі Філармоніі, пракансультыраваў кіраўніка хора тав. Васільева наконт музыкі да мантажа «Радзіме і праваднру» і т. д.

Прыход тав. Сакалоўскага ўліў свежы струмень у работу хора. Заўвагі кампазітара былі выслуханы з велізарнай увагай. Гэтыя заўвагі трапілі ў «самую кропку», ускрылі асноўныя недахопы ў выкананні паасобных песень.

І ў тав. Сакалоўскага засталося самае лепшае ўражанне аб калектыве фабрыкі. «З гэтага хора выйдзе толк»— заявіў тав. Сакалоўскі.

На развітанне ён абяцаў рэгулярна наведваць рэпетыцыі хора і дапамагчы яму дасягнуць сур'ёзных поспехаў.

Ф. П.

Арганізацыя Менскага самадзейнага сімфанічнага аркестра

Дом народнай творчасці БССР пачаў укамплектаванне Менскага гарадскога самадзейнага сімфанічнага аркестра. Дырыжорам аркестра даў згоду працаваць заслужаны артыст рэспублікі А. Л. Бяссмертны.

У аркестр запрашаюцца самадзейныя музыканты, якія іграюць на смычковых, медных, драўляных і духавых інструментах.

Сярод першых жадаючых прыняць удзел у аркестры — строгаль гарбарні «Бальшавік» Д. А. Бенгіс (скрыпка), педагог 44-й чыгуначнай школы С. А. Гурыновіч, 57 год (скрыпка) і яго жонка — педагог 10-й школы В. Н. Гурыновіч, 55 год (раяль), эканаміст Саюзкінапраката Е. В. Баландовіч (раяль) і іншыя.

У аркестр будуць уключаны найбольш здольныя ўдзельнікі самадзейнасці. Распрацоўваецца план вучэбнай і практычнай работы аркестра.



Група выдатнікаў вучобы тэатральнага вучылішча БССР. На здымку: у першым радзе (злева направа): **Міронччык М. Ю., Карповіч М. Я.;** другі рад (злева направа): **Говар-Бандарэнка А. М., Барысовіч А. В. і Іваноў Л. В.**

Фота Каплінскага.

БОЛЬШ ДАПАМАГАЦЬ ТЭАТРУ ЛЯЛЕК

Тэатр лялек БССР, які працуе ў Гомелі, карыстаецца вялікім поспехам у дзяцей. Яго апошнія пастаноўкі «По щучьему веленью», «Веселый портняжка», «Гусенок» і інш. наведала звыш 60 тысяч дзяцей. Усяго тэатрам дадзена 122 спектаклі. Тэатр працуе не толькі ў самым горадзе, але выязджае і ў раённыя цэнтры, у сельскія школы. Тэатр лялек штодзённа атрымлівае дзесяткі пісем ад юных гледачоў.

Вучаніца школы імя Свердлова піша: «Дарагія акторы. Шлю вам шчырае дзякуй за ваша цікавае прадстаўленне—«По щучьему веленью». Вельмі спадабаўся мне той момант, калі Емеля знаёміць царэўну з ляснымі звярамі. Я хацела-б паглядзець казку «О золотом петушке». Я вучаніца IV класа «С». Вучуся на выдатна. У музычнай школе я таксама выдатніца. Зіна Фрыдлянд».

У водгуках можна сустрэць парады гледача тэатру. «У момант, калі палка б'е цара, атрымліваецца ненатуральны гук. Дрэва трэба зрабіць больш мяккім»,—раюць Светлана і Жэня, вучаніцы IV і II класаў. Юныя гледачы просяць прыязджаць часцей у госці і прывозіць новыя пастаноўкі па казках Пушкіна, Салтыкова-Шчэдрына і г. д.

Тэатр прыносіць задавальненне не толькі дзецям, але і дарослым. Палітрук Н-скай часці піша: Тэатр пры выездзе даў у нашай часці пастаноўку «По щучьему веленью». Выдатна выконвалі артысты свае ролі, чым паказалі поўнае авалоданне майстэрствам сваёй справы. Асабліва вылучаліся майстэрскім выкананнем артысты, што выконвалі ролі Емелі, князя, салдата, ваяводы і царэўны. Чырвонаармейцы і начальніцкі склад, прагледзеўшыя спектакль, добра і культурна адпачылі пасля заняткаў і засталіся вельмі задаволенымі. За добрае, культурнае абслугоўванне калектыву Тэатра лялек і дырэкцыі прыносім чырвонаармейскае дзякуй».

Так тэатр разбурае ілжывы прадрассудак, што марыянеткі могуць захапляць толькі дзяцей.

Тэатр лялек не абмяжоўваецца толькі аднымі пастаноўкамі. Тэатр выкарыстоўвае і іншыя формы арганізацыі адпачынку юнага гледача. У школах Гомеля тэатр арганізаваў рад літаратурна-мастацкіх вечароў, прысвечаных героіцы грамадзянскай вайны,— «Сталін у творчасці народаў СССР» і інш. Літаратурна-мастацкія вечары карысталіся ў школах вялікім поспехам.

Вядучы такую плённую работу, тэатр, здавалася-б, павінен быў карыстацца ўвагай і з боку мясцовых арганізацый. На справе, нажаль, атрымліваецца інакш. Палац піянераў і бюро піянераў пры гаркоме камсамола не аказваюць дастатковай увагі Тэатру лялек, не ствараюць яму патрэбных умоў для работы. Абласны і гарадскі аддзелы народнай асветы падыходзяць да работы тэатра таксама толькі з пазіцый спажыўца.

А. Д-КО.

50 ГРАМАТ УДЗЕЛЬНІКАМ ШЭФСТВА НАД ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ

У азнаменаванне 15-годдзя шэфства работнікаў мастацтваў над Чырвонай Арміяй, ЦК саюза работнікаў мастацтваў узнагародзіў ганаровымі граматамі 5 мастацкіх калектываў БССР і 45 асобных работнікаў.

За актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні культурнага шэфства ўзнагароджаны Тэатр оперы і балета, Менскі Белдзяржрамтэатр, Дзяржфілармонія, Яўрэйскі дзяржаўны тэатр і Кансерваторыя.

З работнікаў тэатраў і музычных устаноў БССР узнагароджаны народныя артысты рэспублікі В. О. Уладамірскі і Л. П. Александроўская, заслужаныя артысты рэспублікі М. І. Дзяніс аў і І. Р. Балоцін, артысты Тэатра оперы і балета—Жэзмер, Зауэнава, Хераска, Гарпф, артысты Дзяржфілармоніі — Шмелькін, Навіцкі, Алексютовіч, Менскага Белдзяржрамтэатра — Янпольскі, Віцебскага Белдзяржрамтэатра — Буракоў, Яўрэйскага дзяржтэатра—Моін, Фрыдман і Гурэвіч, Рускага драмтэатра — Біруковіч і Рэшымаў, Кансерваторыі—Арлоў і Нісневіч, старшыня шэфскай камісіі пры Беларускім камітэце прфсаюза работнікаў мастацтваў тав. Герман, дырэктар Філармоніі тав. Прагін, дырэктар Магілёўскага музычнага вучылішча тав. Зісман і інш.

КАНЦЭРТЫ АРКЕСТРА НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ ІМЯ В. В. АНДРЭЕВА

23 студзеня ў Віцебску пачаў свае канцэрты аркестр народных інструментаў імя В. В. Андрэева Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі, які праводзіць гастрольную паездку па Савецкаму Саюзу ў сувязі з 50-годдзем з дня свайго існавання.

Першае выступленне «гуртка балалаечнікаў», створанага маладым таленавітым музыкантам В. В. Андрэевым у складзе 7 чал., адбылося 20 сакавіка 1888 года.

У годы царскага рэжыму калектыў балалаечнікаў нацярпеўся шмат гора. Уласнікі канцэртных залаў, якія падыходзілі да «плебейскай» балалайкі з прадузятай думкай, часта адмаўляліся прадаставіць гуртку памяшканне для выступленняў. Многія артысты — «арыстакраты» адмаўляліся прымаць удзел у канцэртах разам з «балалаечнікамі». Толькі сярод прагрэсіўных людзей таго часу, сапраўдных цаніцелей народнай творчасці — славутага піяніста і кампазітара А. Г. Рубінштэйна, кампазітара П. І. Чайкоўскага, Льва Талстога — В. В. Андрэеў знаходзіў падтрыманне ў сваёй рабоце.

Аркестр пачаў па-сапраўднаму жыць і тварыць толькі пры Савецкай уладзе. Савецкі ўрад, прыняўшы пастанову аб арганізацыі аркестра народных інструментаў пры Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі, ператварыў старэйшы аркестр імя В. В. Андрэева ў сапраўдны ўзорна-паказальны прафесіянальны калектыў, закліканы знаёміць масы працоўных з узорамі народнай творчасці і з творчасцю савецкіх і класічных кампазітараў у своеасаблівай, жывой і даходчывай перадачы народных інструментаў.

У сучасны момант калектыў аркестра налічвае 60 чалавек, у яго складзе—рад масцітых спецыялістаў, працуючых у аркестры звыш 40 год.

27 студзеня аркестр імя Андрэева прыехаў у Менск, дзе дасць 10 канцэртаў.

Новы тэатр у Гомелі

Соўнарком БССР прыняў пастанову аб пабудове ў Гомелі новага драматычнага тэатра на 800 месц. Сцэна тэатра будзе прыстасавана і для оперных пастановак. Кошт будаўніцтва вызначан у 4,5 мільёна рублёў. Тэатр будзе пабудаван на Савецкай плошчы.

Беларускаму ўпраўленню па справах мастацтваў прапанавана не пазней 1 сакавіка г. г. прадставіць у СНК БССР праектнае заданне на пабудову тэатра ў Гомелі.

АБСЛЕДВАННЕ МУЗЫЧНЫХ ВУЧЫЛІШЧАЎ І ШКОЛ БССР

Упраўленне па справах мастацтваў камандзіравала для абследвання і аказання практычнай дапамогі музычным вучылішчам і школам групу спецыялістаў. Сярод камандзіраваных праф. Ціханаў, дацэнты Бяссмертны, Арлоў, Сцегены, Карын, Бергер, Аладаў, Мацісон, настаўнікі Жыў Е., Нісневіч, Пукст, Марцінсон, а таксама тт. Герман, Фрыдман, Зісман і Эльё.

ВЕРШЫ САРЫ КАГАН

(«Мая радзіма», ДВБ, Менск, 1938)

Выйшла з друку новая кніга вершаў яўрэйскай савецкай паэтэсы Сары Каган.

Тэматыка гэтых вершаў самая разнастайная. Выдзяляецца група вершаў, навеяных сумнымі ўспамінамі аб бязрадасным маленстве, праведзеным у вялікай сям'і яўрэя-бедняка. Запамінаецца вельмі выразны верш аб тым, як маленькая дзяўчынка, пасучы гусей на выгане, збірае ў збанок кожнае пёрка, бо — як наказала ёй маці — дванаццацігадовая дзяўчынка павінна ўжо ўмець клапаціцца аб сабе. Ужо тады дзяўчынка адчула ўсю несправядлівасць і жорсткасць капіталістычнага свету. Стомленай, ёй усё ніжэй і ніжэй нагінацца за пер'ямі. «А людзі-ж кажуць, што пер'е такое лёгкае...»

І разам з тым — рад вершаў, асноўным матывам якіх з'яўляецца — радасць, велізарнае шчасце, вялікая ўдзячнасць партыі і радзіме за шчаслівае, квітнеючае жыццё, за светлую долю, якую атрымала жанчына пры Савецкай уладзе. Радасныя, аптымістычныя, поўныя гарачай любві да таварыша Сталіна, да партыі і ўрада, гэтыя вершы сапраўды з'яўляюцца выражэннем патрыятычных пачуццяў новай савецкай жанчыны.

Ужо адны загалоўкі вершаў («Песня аб Сталіне», «Серго Орджанікідзе», «Да дня Сталінскай Канстытуцыі» і інш.) сведчаць аб вялікай зацікаўленасці паэтэсы ва ўсіх падзеях, якія адбываюцца ў нашай краіне. У кнізе няма абыякавых, роўнадушных вершаў. Усе яны напісаны шчыра, ад усёй душы. Кожны такі верш — повад, магчымасць для паэтэсы выразіць сваю ўдзячнасць, сваю любоў да радзімы. Толькі сапраўднае хваляванне магло падказаць паэтэсе гэтыя вершы. Шчырасць, насычанасць твораў пачуццём з'яўляюцца безумоўна адным з дадатных бакоў у творчасці С. Каган.

Праўда, у яе яшчэ нехапае паэтычнай тэхнікі для таго, каб належна выразіць, увасобіць свае пачуцці. Незаўсёды ёй удаецца і сканцэнтрыраваць свае пачуцці і ўражанні вакол пэўнага паэтычнага вобраза, паэтычнай думкі. Адсюль — многаслоўе і расплыўчатасць у некаторых вершах, неахайнасці ў мове і паасобных выразах. Адсюль і той налёт некаторага прымітывізма, які ляжыць на паасобных творах С. Каган.

Сапраўды — «Я пакутавала многа, дык цяпер спяваць павінна!» Але-ж ніякая жыццёвая практыка не можа акупіць прабелаў у паэтычнай тэхніцы. І толькі тады, калі паэтэсе ўдаецца знайсці для свайго твора цікавую «выходную пазіцыю», калі ёй удаецца пакласці ў аснову верша паэтычны вобраз, — тады самі сабой адпадаюць і многаслоўе, і расплыўчатасць, верш становіцца больш сканцэнтрыраваным, больш чоткім становіцца яго ўнутраны малюнак, паяўляецца пластычнасць, навізна і свежасць паэтычных сродкаў.

Да ліку такіх твораў безумоўна належыць паэма «Тры лявоніхі». Ужо сама ідэя і прынцып пабудовы паэмы ўяўляюць вядомую цікавасць. Паэма расказвае аб трох выпадках, калі батрацкай дачцы, прыгожай Дуні, прыходзілася скакаць лявоніху. Адзін раз гэта было ў панскім палацы — яе прымусілі тады танцаваць перад п'янымі гасцямі пана Казіміра. У другі раз яна танцавала перад раз'юшаным белапольскім бандытам. У трэці раз яна танцуе ўжо на вялікім свяце калгаса, старшынёй якога з'яўляецца яна сама.

Такім чынам гэтыя тры лявоніхі становяцца вузлавымі момантамі ў біяграфіі Дуні, у якіх адлюстроўваецца ўсё яе жыццё, увесь яе шлях ад забітай, прыгнечанай жанчыны да выдатнай прадстаўніцы савецкіх свабодных жанчын, якім Савецкая ўлада дала магчымасць поўнага скарыстання сваіх здольнасцей.

Паэма распадаецца на тры звяны, фармальна нічым не звязаныя паміж сабою. Іх звязвае невідочнымі ніцямі біяграфія Дуні. Такая форма пабудовы — адсутнасць пераходаў паміж часткамі паэмы пры аднастайнасці матыву, паўтараючагася ва ўсіх яе звеннях, — з'яўляецца арыгінальным прыёмам, падкрэсліваючым драматычную лінію паэмы.

У паэме ёсць рад слабых месц. Але ў ёй ёсць і драматызм, і паэтычнасць, і добрае пачуццё, чуллівасць да беларускага і яўрэйскага фальклору

Так, пасля малюнка вялікай галечы, у якой праходзіць жыццё старога пастуха Сцяпана і яго дачкі Дуні, у якіх няма «ні зямлі, ні хлеба» дзея адразу пераносіцца ў панскі палац:

А у Казіміра — пана
Есць віно ў поўных збанах,
Многа коней, і свіней,
І авечак, і курэй,
А у Казіміра — пана
Скрыпкі, флейты, барабаны,
І, калі толькі захоча,
Яму граюць днём, і ночку.
А у Казіміра — пана
Служыць многа Зосек, Ганак,
Толькі Дуні нехапала,
Дык за Дуняю паслалі.

І далей:

А у Казіміра — пана
Усе сталы сервіраваны,
Есць і срэбра і крышталь —
Госці прыбылі на баль.
Белы гальштук, чорны фрак,
Пудра густа на шчаках,
Злосць і сквапнасць у вачах
І усмешка на губах.

Пераклад наш не перадае ўсёй вартасці прыведзенага фрагменту. Нам у ім важна было толькі паказаць уменне С. Каган карыстацца кантрастамі, рознымі рытмамі і г. д.

Да ліку лепшых вершаў трэба таксама аднесці «Маленства», «У лодцы» і інш. Асобна трэба адзначыць верш «Радзіма». Багатая вобразнасць, прыўзнятасць і сапраўдная непадкупная цеплыня робяць гэты верш адным з лепшых у кнізе «Мая радзіма». Вельмі цікавым з'яўляецца таксама і верш «Спатканне». Тэма яго — спатканне маці з дачкой, якая скочыла з парашутам толькі на адну хвіліну, каб абняць і расцалаваць матулю і зараза-ж пабегчы ў поле, туды, дзе яе чакаюць самалёты. Наіўная рамантычнасць і ўнутраная лагічнасць у развіцці вобразаў у гэтым вершы нагадваюць вядомыя яўрэйскія народныя песні.

Некалькі слоў аб заключным раздзеле кнігі — «Лірыка». С. Каган — удумлівая паэтэса. Да сваіх былінна-лірычных вершаў яна падыходзіць вельмі асцярожна, нават з нейкай сарамлівасцю. Гэта яшчэ раз гаворыць аб паэтычных здольнасцях Сары Каган, аб яе ўнутраным паэтычным такце.

Не ўсе вершы Сары Каган стаяць на высокім мастацкім узроўні. Але-ж яе шчырасць, адсутнасць у яе ўсякай рысоўкі і яе сардэчная цеплыня прыцягваюць да яе самыя шчырыя сімпатыі чытачоў.

Н. ДЗІМЕНШТЭЙН.

Нам. адказнага рэдактара
А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

...ск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 78, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № Д—799.